ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЧАЦВЕР, 9 ЛЮТАГА 1939 г. № 8 (422)

ЦАНА 20 КАП.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

САЮЗ СОВЕТАЎ—РАДЗІМА КУЛЬТУРЫ І ЦЫВІЛІЗАЦЫІ

Савецкая літаратура—самая маладая літаратура, але па сваёй ідэйнасці—самая перадавая літаратура ў свеце. Савецкія пісьменнікі і паэты мастацкімі сродкамі дапамагаюць камуністычнай партыі ў барацьбе за ажыццяўленне перадавых ідэй чалавецтва, ідэй Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна, у барацьбе за пабудову камуністычнага грамадства.

Нідзе ў свеце не цэніцца так высока праца, не цэніцца так высока літаратура, як у Саюзе Советаў. Нідзе ў свеце, акрамя Савецкага Саюза, не знойдзеш такой краіны, дзе-б за песню, аповесць, драму ўзнагароджвалі орданамі.

У краінах капіталізма і на сёнешні дзень літаратар — раб. Ён пазбаўлен магчымасці адкрыта выступаць за разнявольнене прыгнечаных, якія стогнуць пад ігам капітала.

Савецкі Саюз — самая перадавая і прагрэсіўная краіна ў свеце, радзіма культуры і цывілізацыі. Творы Шэкспіра і Гейне, Мальера і Гётэ, Стэндаля і Байрана і многіх іншых літаратараў з сусветнымі імёнамі ставяцца ў нас на сцэне і чытаюцца больш, чым на іх радзіме.

У фашысцкай Германіі апалелыя гітлераўцы спальваюць на кастрах лепшыя здабыткі чалавечай мыслі. Скарбніцы сусветнай культуры. Краіны фашызма—гэта царства цемры. Авантурыстыя фашысты і іх бяздарныя пісакі распальваюць чалавеканенавісніцтва паміж народамі, уцягваюць ужо чалавецтва ў другую крывавую імперыялістычную вайну. Гэтым самым яны хочуць спыніць магутны наступ сусветнай пралетарскай рэвалюцыі.

Саюз Советаў — гэта дружная сям'я народаў. Шматнацыянальная літаратура—гэта дзіця Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Нам адкрылася дарогі як класікі рускай літаратуры і літаратуры іншых народаў СССР — Пушкін і Шаўчэнка, Л. Талстой і Руставелі, Гогаль і Ахундаў, Салтыкоў-Шчадрын і Налбандзян, так і нашы сучаснікі — А. Талстой і Купала, Тычына і Колас, Дадзіяні і Бядуля, Карнейчук і Лынькоў, Фадзееў і Самуйлёнак, Шолахаў і Броўка, Асееў і Глебка. Усе яны, кожны ў меру сваіх здольнасцей, валі і валудзь барацьбу за прагрэс і культуру нашай радзімы. Усе яны заглядаюць і заглядаюць у будучыню.

На творах неўміручай рускай і сусветнай класікі вучацца маладыя беларускія літаратары. Асаблівя вялікую паслугу аказаў нам пачынальнік пралетарскай літаратуры геніяльны А. М. Горкі і лепшы пісьменнік савецкай эпохі В. В. Маякоўскі.

Беларускі народ, як і ўсе народы Савецкага Саюза, горача сустрэў Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб узнагароджанні паэтаў і пісьменнікаў — сваіх верных сыноў.

Пісьменнікі і паэты — орданоносцы, усе літаратары Савецкага Саюза дзякуюць камуністычнай партыі, вялікаму Сталіну, савецкаму ўраду за ўзнагароджанне работнікаў літаратуры.

Ордананосная Савецкая Беларусь мае сваю ордананосную літаратуру. Гэта абавязвае нашых літаратараў працаваць яшчэ больш і лепш на карысць нашай сацыялістычнай маці-радзімы.

Узнагароджанне лепшых пісьменнікаў Савецкай Беларусі супала з прабываннем дэлегацыі беларускіх літаратараў і працаўнікоў мастацтваў у Маскве. Як заўсёды, гасцінна прыняла Масква прадстаўнікоў літаратуры і мастацтваў Савецкай Беларусі.

Пачынаючы з сустрэчы на вакзале, на сходзе пісьменнікаў гор. Масквы, з сустрэчы з рабочымі і савецкай інтэлігенцыяй аўтазавода імя Сталіна, дзе спачатку выступілі беларускія пісьменнікі і спевакі, а потым перад дэлегацыяй — удзельнікі мастацкай самадзейнасці завода, і потым на сустрэчы ў рэдакцыі газеты «Праўда», у клубе чыгуначнікаў, у Доме журналіста, у Палітэхнічным музеі, у Доме актора, на сустрэчы з ордананосцамі Малага тэатра, — усюды, усюды надзвычай цёпла, па-братняму, не як гасцей, а як гаспадароў прымалі маскоўчы прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі. Шмат прывезлі беларускія літаратары і мастакі ў Маскву, але з Масквы прывезлі яшчэ больш. Яны прадэманстравалі ў Маскве росквіт беларускай літаратуры і натхніліся на далейшую працу на карысць савецкага народа.

Жаданне працаваць больш і лепш, жаданне ўславіць вялікіх правадыроў чалавецтва — Леніна і Сталіна, услаўіць свой народ — пранізвае думкі і мары ўсіх удзельнікаў беларускай дэлегацыі — пісьменнікаў і мастакоў.

Беларуская літаратура і мастацтва ўступілі ў найадказнейшы перыяд свайго развіцця. Увосені 1939 года ў Маскве адбудзецца дэкада беларускага мастацтва.

Пісьменнікі і мастакі Савецкай Беларусі, натхнёныя надыхозячымі гістарычным XVIII з'ездам ВКП(б), бяруць на сябе канкрэтныя абавязацельствы, сэнс якіх — узнімаць нашу літаратуру і мастацтва на вышэйшую ступень развіцця.

Ганаровая задача нашай літаратуры і мастацтва, нашага народа — паказаць росквіт беларускага мастацтва, нацыянальнага па форме і сацыялістычнага па зместу, у Маскве, перад партыяй і ўрадам магутнага Савецкага Саюза.

Нам неабходна напісаць п'есу аб Леніне і Сталіне, стваральніках беларускай дзяржаўнасці, нашага шчасця. Нам неабходна напісаць п'есу, у якой паказаць, што заходнія рубяжы вялікага Савецкага Саюза знаходзяцца на бальшавіцкім замку, што нашы граніцы — непрыступная крэпасць, аб якую разаб'юць сваё бязглуздыя галовы фашысты, якія не пакідаюць надзеі напасці на першую ў свеце сацыялістычную дзяржаву. Нам неабходна напісаць п'есу, у якой паказаць вышэйшы рабочы клас, калгаснае сялянства, савецкую інтэлігенцыю. Нам неабходна напісаць п'есы, у якіх паказаць вобразы сапраўдных вялікіх Леніна і Сталіна — Фрунзе, Кагановіча, Мяснікова, Ежова, вёўшых барацьбу за ўмацаванне Савецкай улады ў Беларусі, за ўмацаванне дыктатуры пралетарыята. На гэтым-ж тэмы неабходна напісаць раманы, паэмы, аповесці.

Пісьменнікі Савецкай Беларусі павінны аказаць усямерную дапамогу маладому Тэатру оперы і балета з тым, каб ён мог ставіць рад высокамастацкіх арыгінальных беларускіх савецкіх опер, такіх опер, якія не сорамна было-б паказаць у Маскве. Усе магчымасці для гэтага ёсць. У Савецкай Беларусі выраслі таленавітыя кадры актораў і спевакоў, якія ў сілах справіцца з адказнейшай задачай стварэння высокаякаснага, поўнакроўнага мастацтва, вартага вялікай ленінска-сталінскай эпохі.

Няхай жыве ордананосная літаратура!

Няхай жыве Саюз Советаў — радзіма сусветнай культуры і цывілізацыі!

Няхай жыве вялікі правадыр, бацька і настаўнік працоўных усяго свету, друг літаратуры — геніяльны СТАЛІН!

СЁННЯ ГРАМАДСКАСЦЬ МЕНСКА СУСТРАКАЕ СВАІХ ПІСЬМЕННІКАЎ-ОРДЭНАНОСЦАЎ

Пісьменнікі БССР, узнагароджаныя за выдатныя поспехі ў развіцці савецкай літаратуры орданамі Саюза ССР. Злева направа: узнагароджаныя орданам Леніна народны паэт БССР Янка Купала, народны паэт БССР Якуб Колас; узнагароджаныя орданам Працоўнага Чырвонага Сцяга т.т. Змітрок Бядуля, Міхась Лынькоў, Эдуард Самуйлёнак; узнагароджаныя орданам «Знак Почета» т.т. Пятро Глебка, Пятрусь Броўка.

Янка КУПАЛА

ЖЫЦЦЁ МАЁ НАЛЕЖЫЦЬ НАРОДУ, ПРАВАДЫРУ

Дзень узнагароджання мяне орданам Леніна з'явіўся самым шчаслівым у маім жыцці. А жыццё маё змалку дзён было не вясёлае, аблітае потам і слязьмі сваімі, потам і слязьмі майго закаванага народа.

З края ў край на заго́нах роднай Беларусі блукаў я ў пацёмках народнага гора і нядолі народнай. Як абяздолены падарожны ноччу на агеньчык, ішоў я на крык чалавека. Страшны, бо гэты крык — крык бязмернага мучэння Беларусі. І, здавалася, канца не будзе вялікаму гору народнаму, катаржнай нявolі народнай.

Дзе шляхі да яснай волі і долі? Дзе светазарная праўда? Калі ўзыйдзе наша сонца і ці ўзыйдзе яно калі-небудзь?

І вось загрымеў гром над краінай. Нездарма «нараджэнне беларускай паэзіі звязана з рэвалюцыяй 1905 года», як і росквіт яе — з сацыялістычнай рэвалюцыяй. На балотных дрыгвах, на лясах і пушчах, у жабрачых хатах беларускага народа, выгадаваная барацьбой, нараджалася надзея на лепшую долю, а з адвечнай нахуты выраста́ла няўявіць да прыгнятальнікаў.

На хвалях людскога гора выплывала яшчэ няясная народу праўда, і тады вось — 34 годы назад, у 1905 годзе — упершыню пачалі складацца мае першыя песні.

Ад першай маёй кніжкі, ад першай «Жалейкі» да сёнешніх дзён прайшло не мала — 30 гол. Доўгай гэтай дарогай ішоў я па-рознаму. Бывала, і спатыкаўся, і дарогу губляў, і ў цянёты трапляў балотныя... Але праведным прыходзіў народ, які не забываў, не пакідаў мяне і выводзіў на правільную сцежку. Гэтак ішоў я перад жыццё.

А вялікі пуд уже хадзіў па беларускіх хатах, хлебам-соллю сустракаў народ ленінскую праўду. І я гэтай праўдзе нізка, шчыра пакланіўся і — жэпска ні добра — праспяваў ёй свае родныя песні.

Спяваў я аб вольным народзе, аб яснай, сонечнай краіне, аб шчасці. Калі наладзіў жыцця прыходзілася спяваць аб горы, то няма нічога болей радаснага для паэта, як права на шчасце вую песню.

А песня мая не магла не быць шчаслівай. Уставала краіна, прыбралася вясеннім вянком, прыхадзібішчы людзей з усіх краін, і ўзнялася на працу, як на вяселле, узнятая з балота проста да неба.

Партыі, вялікаму Сталіну, старэйшаму брату — рускаму народу адданая самая ўсхваляная, самая гарачая і ўдзячная любоў беларускага народа. І калі аб Сталіне, аб бацьку, беларускі народ спявае песню Беларусь, то і я спяваю.

Табе, правадыр, мае песні і думы,
І шчырыя шчыра сэрца парывы.
Бо хто калі сніў і хто калі думаў,
Што буду я вольны, што буду
шчаслівы!

Што явою станецца сон мілёнаў,
Цудоўныя казкі ў жыццё
ператворым,
Абсеем пасевам жывучым загоны
І сцежкі намецім да сонца і зораў.
На небе — шлях млечны, на небасхіле.

На гонях красуе пшаніца і жыта...
Бягуць, не спыняюцца думкі-сокалы
К табе, правадыр мой, у сонцы
спавіты!

Багатай узнагародай адказаў мне народ на мае песні.

У многа разоў узнагароджана мая скромная, але шоўшчая заўсёды ад самага сэрца праца. Ордэн Леніна, вялікага Леніна, чыё імя адно гучыць, як лепшая песня ў народзе, дадзен мне ўрадам.

Гэту ўзнагароду, вялікую як жыццё, я прымаю, бяру і буду берагчы, як самае заветнае і дарагое ў свеце. А жыццё маё да апошняй мінуты будзе аддадзена народу і яго правадыру — вялікаму Сталіну.

Якуб КОЛАС

Пры савецкай уладзе поўнасцю разгарнуліся нашы творчыя магчымасці

Акт высокай ацэнкі маёй пісьменніцкай дзейнасці — узнагароджанне орденам Леніна — глыбока і радасна мяне ўсхваляваў. Беларускі народ, прыгнечаны ў мінулым, стаў у нашы савецкія дні свабодным і шчаслівым. Ён будуе сваю нацыянальную культуру і свае вольнае жыццё на аснове ленінска-сталінскай палітыкі. Ці мог я марыць у дні майго юнацтва, што гэта з'ява агромністага гістарычнага значэння адбудзецца на маіх вачах?

Сумнымі і журботнымі былі песні беларускага народа, бо не бачыў ён дарогі, каб выйсці з галечы, гнёту і ўніжэння. Радаснымі і шчаслівымі сталі гэтыя песні пасля Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі. Такі-ж быў і лёс беларускіх паэтаў, якія імкнуліся служыць свайму народу: не было ў мінулым у іх радасных матываў шчасця і свабоды, цяпер-ж яркія і радасныя матывы сталі асноўнымі ў іх творчасці.

У кожным з нас, ці малады ён ці стары, шырока разгарнуліся ўсе творчыя магчымасці. Ясным і светлым стаў наш шлях, умацавалася і ўсведамілася наша светаразуменне. Глыбей і шырэй сталі мы бачыць маляўнічы ва-роднага жыцця і лёс людзей, што на нашых вачах становіцца шчаслівым. Разнастайнейшым і ярчэйшым стала наша творчасць, і ў кожным з нас абудзілася смелае імкненне стаць мастаком, пастойным вялікай эпохі.

Мая скромная паэтычная дзейнасць адзначана савецкім урадам і вялікай партыяй Леніна—Сталіна такім высокім актам увагі. І гэта яшчэ больш напаўняе маё сэрца імкненнем аддаць усе свае сілы на служэнне сацыялістычнай радзіме, не красаванню і далейшаму магутнаму развіццю пад яі раўніціштам непахіснай партыі бальшавікоў і роднага ўсім нам друга, яе правадыра.

Няхай жыве, квітнее вялікая Савецкая краіна і яе народы!

Няхай жыве вялікі настаўнік, друг і правадыр усіх прыгнечаных народаў — мудры Сталін!

Пятро ГЛЕБКА

АДДАДЗІМ УСЕ СІЛЫ І ЗДОЛЬНАСЦІ САВЕЦКАМУ НАРОДУ

Родная, любімая Масква сустрэла нас, як і заўсёды, надзвычай ветліва і шчыра. Цяжка перадаць словамі тую цеплыню і глыбокія братнія пачуцці, з якімі сустракалі нас рабочыя і савецкая інтэлігенцыя ў Палацы культуры аўтазавода імя Сталіна, у клубе чыгуначнікаў, у Доме журналіста, у Палітэхнічным музеі, у Доме актора, — усюды, дзе-б мы ні выступалі. Мы адчувалі, што не кожнае слова нашых вершаў было зразумела нашым слухачам. Але мы пачуццё, нашы думкі былі ім блізкімі і роднымі. І гэтае разуменне шчырых парываў народу іх сэрцах, бо гэтыя пачуцці і думкі былі пачуццямі радасці да вялікага савецкага народа, да яго геніяльнага правадыра таварыша Сталіна.

У Маскве мы даналіся аб той высокай узнагародзе, якою партыя і савецкі ўрад адзначылі работу савецкіх беларускіх пісьменнікаў і паэтаў. Тэты дзень, і Масква, і гэты незабыўных дзён будуць вечна жыць у нашай памяці.

Вяртаючыся ў Беларусь, у сталіцу нашай рэспублікі Менск, мы ўсе гарым адзіным жаданнем:

— Аддаць усе нашы сілы і здольнасці на карысць свабоднага нашага народа; ствараць такія творы, якія-б былі вартыя нашай сонечнай радзімы, вялікай партыі і мудрага правадыра таварыша Сталіна.

Змітрок БЯДУЛЯ

СЭРЦА ПЕРАПОЎНЕНА ШЧАСЦЕМ

Масква...

Родная, прыгожая і любімая маці ўсяго 170-мільённага савецкага народа. Уначы велізарныя рубінавыя зоры Крэмля свецяцца ў цёмна-сінім небе і вяшчаюць пра шчасце для ўсяго працоўнага чалавецтва. Удзень тысячы людзей з усіх канцоў СССР жывым патокам імкнуцца ў маўзалей Леніна.

А тут бліска-бліска жыве і працуе геніяльны кавааль чалавечага шчасця — наш любімы правадыр, родны Сталін.

З трапетам у сэрцы глядзіш на гістарычны Крэмль. Тут самае гарачае сэрца, тут самы геніяльны мозг нашага народа. Тут знаходзіцца наша сонца, якое абагрэвае і натхняе працоўных усяго свету. Тут свеціць новае сонца, ад якога слепнуць усе ворагі чалавецтва.

Масква...

Ты сустрэла нас, беларускіх пісьменнікаў, як сваіх сыноў. Тут кожны табе — брат і кожная — сястра. Тут мы, беларускія пісьменнікі, разам з пісьменнікамі ўсіх народаў Саюза ССР атрымалі орданы — вышэйшую ўзнагароду ад савецкага ўрада, ад вялікай партыі Леніна—Сталіна, ад усяго савецкага народа.

Нязведанае шчасце. Вялікі гонар. Сэрца перапоўнена гарачым пачуццём. Такая ўзнагарода абавязвае кожнага з нас да яшчэ больш вялікіх дасягненняў, да яшчэ больш поспехаў.

У кожнага з нас у сэрцы сама сабою расце прысяга:

— З яшчэ большай сілай працаваць на карысць маці-радзімы! А калі патрэбуецца — аддаць сваё жыццё за справу Леніна—Сталіна, за шчасце савецкага народа, за камунізм, за любімага Сталіна!

Міхась ЛЫНЬКОЎ

ВЫКАНАЕМ СВОЙ ДОЎГ ПЕРАД РАДЗІМАЙ

Высокая ўзнагарода, якой савецкі ўрад адзначыў групу беларускіх пісьменнікаў, з'яўляецца лепшай ацэнкай поспехаў усёй беларускай савецкай літаратуры. Я ўпэўнен, што нашы «старыя» і маладыя пісьменнікі прыкладуць усе сілы, каб узняць на яшчэ больш высокі ўзровень беларускае мастацкае слова, напішуць новыя творы, якія па-праву ўвойдуць у скарбніцу культуры нашай цудоўнай сацыялістычнай радзімы і будуць чытацца усімі народамі вялікага Савецкага Саюза.

Доўг кожнага пісьменніка — адзначыць гістарычны XVIII з'езд партыі высокамастацкімі творамі, канкрэтнымі творчымі планамі. Доўг кожнага з нас — апраўдаць высокую ўзнагароду. Разам з усімі ўзнагароджанымі таварышамі, разам з усімі пісьменнікамі Савецкай Беларусі ўпарта будуць працаваць над новымі творамі аб людзях і справах Вялікай Сталінскай эпохі.

Кіславодск (па тэлеграфу).

Пятрусь БРОЎКА

ПАМЯТНЫЯ ДНІ

Масква — сэрца радзімы. Горача любіць кожны савецкі грамадзянін чырвоную сталіцу. Усе дні, якія мы правялі ў Маскве, мы адчувалі вялікую ўвагу да сябе працоўных і савецкай інтэлігенцыі.

У Маскве я сустрэў найшчаслівейшы дзень свайго жыцця. Усё жыццё будзе помніцца 1 лютага 1939 года, калі я прачытаў у газетах аб узнагародзе.

Цяжка выказаць словамі пачуцці радасці. Знаю адно, што толькі вялікаю, упартаю працаю на карысць любімай маці-радзімы можна аддзякаваць партыі і ўраду.

Вялікі Сталін адзначыў савецкіх літаратараў высокай узнагародай. Усе сілы аддадзім, каб апраўдаць бацькоўскія клопаты вялікага правадыра аб нас.

ВЯЛІКІ ГОНАР, ВЯЛІКАЯ АДКАЗНАСЦЬ

Савецкая ўлада і партыя высока цэніць працу савецкага пісьменніка. Лепшыя прадстаўнікі шматнацыянальнай савецкай літаратуры ўзнагароджаны орданамі. Гэта вялікі гонар — быць у ліку лепшых у самай перадавой літаратуры свету, у той літаратуры, якую паставалі вялікі Максім Горкі, якая вырасла і расцвіла пад сонцам Леніна і Сталіна.

Атрымаўшы ўзнагароду за сваю таленавітую працу і лепшыя беларускія пісьменнікі — мае сябры і таварышы. Я іх ад душы віншую і жадаю ім яшчэ больш поспехаў.

Высокая ацэнка партыі і ўрада ўскладае вялікую адказнасць на работнікаў літаратурнага фронта. Кожны пісьменнік гэту адказнасць адчувае і прыкладзе ўсе сілы да таго, каб наша савецкая літаратура стала яшчэ лепшай, каб яна дала такія велічныя творы, такія яркія вобразы, якіх яшчэ не было ў сусветнай літаратуры. Я веру, што такія творы будуць, бо ніколі ў гісторыі і ні ў адной краіне не было яшчэ такіх умоў для росквіту мастацтва, якія ёсць у нашай сонечнай краіне сацыялізма.

Кандрат КРАПІВА.

ВЯЛІКІ АБАВЯЗАК

Дзесяць дзён, якія беларускія пісьменнікі правялі ў Маскве, з'яўляюцца для кожнага з нас светлай падзеяй у жыцці. Надзвычай цёпла прахадзілі вечары беларускай культуры, якія былі яркай дэманстрацыяй дружбы двух братніх народаў — рускага і беларускага.

У дні, калі нашу дэлегацыю гасцінна сустракала грамадскасць Масквы, новая падзея радасна ўсхалынула сэрцы савецкіх літаратараў — урад узнагародзіў лепшых пісьменнікаў ордэнамі Савецкага Саюза.

Гэта абавязвае ўсіх нас працаваць больш і лепш на славу вялікага народа, на славу партыі Леніна—Сталіна.

Савецкія пісьменнікі гэты вялікі абавязак выканаюць.

Аркадзь КУЛЯШОЎ.

ПРАЦАВАЦЬ І ТВАРЫЦЬ, ТВАРЫЦЬ І ПРАЦАВАЦЬ

Наша паездка ў Маскву шчасліва супала з велізарнай падзеяй у савецкай літаратуры — з узнагароджаннем вялікай групы савецкіх пісьменнікаў орданамі Савецкага Саюза.

Паездка ў сталіцу нашай радзімы яшчэ больш умацавала дружбу беларускіх пісьменнікаў з рускімі пісьменнікамі, з майстрамі слова братніх літаратур.

Мы пабывалі ў лепшых тэатрах Масквы, выступалі ў рабочых аудыторыях, перад інтэлігенцыяй. Усюды нас сустракалі радасна і гасцінна.

Незабыўнае ўражанне зрабіў на нас Палац культуры аўтазавода імя Сталіна. Гэта — культурная ўстанова грандыёзнага памеру.

Паездка ў Маскву дала нам вялікую зарадку. Хочацца працаваць і тварыць, тварыць і працаваць.

Г. КАМЯНЕЦКІ.

УРУЧЭННЕ ОРДЭНАЎ І МЕДАЛЕЙ САЮЗА ССР

7 лютага старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР тав. М. І. Калінін у прысутнасці раду членаў Прэзідыума ўручыў орданы і медалі групе таварышоў, узнагароджаных за ўзорнае выкананне баявых заданняў, за доблесць і мужнасць, праяўленыя пры абароне раёна возера Хасан.

Орданы і медалі атрымлівае затым група таварышоў, узнагароджаных за ўзорнае выкананне спецыяльных заданняў урада па ўмацаванню абароннай магутнасці Савецкага Саюза і за выдатныя поспехі ў баявой, палітычнай і тэхнічнай падрыхтоўцы злучэнняў і часцей РСЧА.

Следам за тым орданы і медалі ўручаюцца работнікам пагранахоў тт. Калыхалаву, Пучкову, Бабушкіну, Несмеянаву, Краўчанка і іншым.

Ордэн Леніна прымаюць прадстаўнікі завода № 8 імя М. І. Калініна. Ордэны і медалі атрымліваюць работнікі завода.

Узнагароды атрымліваюць затым тт. Скафа, Арэф'еў, Клейменаў, Коган, Калінін і іншыя, узнагароджаныя за навуковую распрацоўку метаду падземнай газіфікацыі вугалю і паспяховае асваенне гэтага метаду на Горлаўскай станцыі.

Орданы ўручаюцца групе пісьменнікаў і паэтаў, узнагароджаных за выдатныя поспехі і дасягненні ў развіцці савецкай мастацкай літаратуры.

Тав. М. І. Калінін сардэчна павіншаваў усіх узнагароджаных і пажадаў ім новых поспехаў у іх далейшай працы.

(ТАСС).

АДКРЫЎСЯ XIII З'ЕЗД КОМСАМОЛА БЕЛАРУСІ

7 лютага ў Менску адкрыўся XIII з'езд комсамола Беларусі. На з'ездзе прысутнічае 508 дэлегатаў. Гэта сталінскія пітомцы: маладыя інжынеры і настаўнікі, камандзіры і лётчыкі, стаханаўцы прамысловасці, транспарту, савецкага земляробства. Гэта знатныя людзі: орданасцы, дэпутаты Вярхоўных Советаў СССР і БССР.

Пасля ўступнай прамовы сакратара ЦК ЛКСМБ тав. Галоўкіна з'езд пачынае сваю работу. На вячэрнім пасяджэнні дэлегаты выбралі кірвочыя органы XIII з'езда ЛКСМБ. У склад прэзідыума выбрана 35 чалавек.

Пад бурныя і доўга несмаўкаючыя апладысменты і воклічы «ура» у склад ганаровага прэзідыума выбіраецца таварышы Сталін, Молатаў, Калінін, Кагановіч, Варашылаў, Андрэеў, Мікаян, Жданаў, Хрушчоў, Ежоў, Берыя, Дзімітроў, Тэльман і Хосе Дыяс.

Бурнымі апладысментамі пакрываецца прапанова аб абранні ганаровым старшынёй XIII з'езда ЛКСМБ таварыша Сталіна. Доўга грымелі апладысменты, не змаўкалі авацыі пры зачытанні прывітальнага пісьма правадыру народаў вялікаму Сталіну.

На гэтым-жа пасяджэнні зацвярджаецца парадак дня XIII з'езда: справаздача ЦК ЛКСМБ і рэвізійнай камісіі, выбары ЦК і рэвізійнай камісіі.

К ВОСЕМНАЦЦАТАМУ З'ЕЗДУ ВКП(б)

ЗМЯНЕННІ У СТАТУЦЕ ВКП(б)

Тэзісы даклада тав. А. ЖДАНАВА на XVIII з'ездзе ВКП(б), адобраныя ў асноўным Палітбюро ЦК ВКП(б)

3-ці ПУНКТ ПАРАДКУ ДНЯ З'ЕЗДА

1. Перамога сацыялізма ў СССР забяспечыла панаванне сацыялістычнай эканомікі. Адпаведна з каранымі зменамі ў галіне эканомікі СССР змяніўся класавы састаў насельніцтва СССР. За годы сацыялістычнага будаўніцтва былі ліквідаваны ўсе эксплуататарскія элементы — капіталісты, купцы, кулакі, спекулянты. Працоўныя СССР — рабочыя, сяляне, інтэлігенцыя—глыбока змяніліся за годы сацыялістычнага будаўніцтва.

Карэнным чынам змяніўся рабочы клас, ператварыўшыйся ў зусім новы клас, вызвалены ад эксплуатацыі, знішчыўшы капіталістычную сістэму гаспадаркі і ўстанавіўшы сацыялістычную ўласнасць на сродкі вытворчасці.

Карэнным чынам змянілася сялянства, ператварыўшаеся ў зусім новае сялянства, вызваленае ад усякай эксплуатацыі, з'яўляючаеся ў сваёй пераважнай большасці калгасным сялянствам, базіруючым сваю работу і сваё дастаянне не на прыватнай гаспадарцы, аднаасобнай працы і адсталай тэхніцы, а на калектыўнай уласнасці, на калектыўнай працы і сучаснай тэхніцы.

Змянілася інтэлігенцыя, стаўшая ў сваёй масе зусім новай інтэлігенцыяй, звязанай усімі сваімі каранямі з рабочым класам і сялянствам. Савецкая інтэлігенцыя — гэта ўчарашнія рабочыя і сяляне і сыны рабочых і сялян, вылучыўшыяся на камандныя пасты. Савецкая інтэлігенцыя служыць не капіталізму, як старая інтэлігенцыя, а сацыялізму і з'яўляецца роўнапраўным членам сацыялістычнага грамадства.

Такім чынам класавыя грані паміж працоўнымі СССР сціраюцца, падаюць і сціраюцца эканамічныя і палітычныя супярэчнасці паміж рабочымі, сялянамі і інтэлігенцыяй. Стварылася аснова маральна-палітычнага адзінства савецкага грамадства. Гэта маральна-палітычнае адзінства савецкага народа атрымала сваё бліскучае пацвярджэнне ў стварэнні блока комуністаў і беспартыйных на выбарах у Вярхоўны Совет СССР і ў Вярхоўныя Советы саюзных рэспублік і ў поўнай перамозе гэтага блока. Вакол партыі выраслі шматлікія кадры непартыйных большэвікоў, перадавых рабочых, сялян і інтэлігентаў, актыўных і свядомых барацьбітоў за справу партыі, праваднікоў яе лініі ў масах.

У гэтай новай абстаноўцы назрэла неабходнасць змянення прадугледжаных статутам умоў прыёму ў партыю новых членаў. Зараз дзеючы, згодна статута партыі, парадак прыёму ў партыю па чатырох розных катэгорыях, у залежнасці ад сацыяльнага становішча прымаемага ў партыю, яўна не адпавядае змяніўшайся ў рэзультаце перамогі сацыялізма ў СССР класавай структуры савецкага грамадства. Патрэба ва ўстанаўленні розных катэгорый пры прыёме ў партыю і рознага кандыдацкага стажа адпадае. У сувязі з гэтым для ўсіх прымаемых у партыю павінны быць устаноўлены адзіныя ўмовы прыёму і аднолькавы кандыдацкі стаж, незалежна ад іх прыналежнасці да рабочага класа, сялянства або інтэлігенцыі.

2. Неабходна дапоўніць статутнае палажэнне аб членах партыі і іх абавязках палажэннем аб правах членаў партыі, лічачыхся само сабой разумеючыміся, але не адзначаных у статуце. Такое дапаўненне статута партыі адпавядае росту актыўнасці членаў партыі і мае выключнае значэнне для павышэння іх адказнасці за справу партыі, для аграджэння членаў партыі ад праяўленняў бюракратызма. Параграф 57-ы статута партыі гласіць, што: «Свабоднае і дзелавое абмеркаванне пытанняў партыйнай палітыкі ў асобных арганізацыях або ў партыі ў цэлым з'яўляецца неад'емным правам кожнага члена партыі, выцякаючым з унутрыпартыйнай дэмакратыі».

Апрача гэтага права ў статуце павінны быць агавораны наступныя правы членаў партыі:

а) права членаў партыі крытыкаваць на партыйных сходах любога работніка партыі;

б) права членаў партыі выбіраць і быць выбранымі ў партыйныя органы;

в) права членаў партыі патрабаваць асабістага ўдзелу ва ўсіх выпадках, калі выносіцца рашэнне аб іх дзейнасці або паводзінах;

г) права членаў партыі звярачацца з любым пытаннем і заявай у любую партыйную інстанцыю аж да ЦК ВКП(б).

3. Статутам ВКП(б) прадугледжаны праводзімыя перыядычнымі рашэннямі ЦК ВКП(б) чысткі партыі. Вопыт паказаў, што надалей неабходна адмовіцца ад масавых чыстак партыі па наступных матывах:

а) метад масавых чыстак, уведзены ў пачатку НЭП'а, у перыяд ажыўлення капіталістычных элементаў, каб аградзіць партыю ад пранікнення ў яе рады людзей, разлагаўшыхся ў сувязі з НЭП'ам, страціў глебу для цяперашняй абстаноўкі, калі капіталістычныя элементы ліквідаваны. Апрача таго, на практыцы, як паказаў вопыт, метад масавых чыстак выключае магчымасць адзіна правільнага індывідуальнага падыходу да членаў партыі, падмяняючы яго агульным стандартным падыходам да членаў партыі «па адной мерцы». У сувязі з гэтым пры масавых чыстках мелі месца шматлікія неабгрунтаваныя выключэнні з партыі, а варожыя элементы, якія прабраліся ў партыю, скарыстоўвалі чысткі для цкавання і збіцця чэсных работнікаў;

б) метад масавых чыстак не дае магчымасці ў поўнай меры ажыццяўляць партыйную ўстаноўку аб уважлівых адносінах да членаў партыі, да работнікаў і на практыцы зачастую вядзе да ўшчамлення правоў членаў партыі;

в) у адносінах да варожых элементаў, прабраўшыхся ў партыю, маскіруючых свой варожы твар сродкамі двурушніцтва і абману партыі, метад масавых чыстак аказаўся мала дзейсным і не дасягаючым мэты;

г) метад масавых чыстак аказаўся звернутым сваім астрыём, галоўным чынам, супроць так званых пасіўных членаў партыі і прыводзіў да выключэння з партыі чэсных і добрасумленных яе членаў па матывах іх, нібы, пасіўнасці.

У сувязі з гэтым перыядычныя масавыя чысткі партыі неабходна адмяніць, устанавіўшы, што партыя можа ў звычайным парадку ачышчаць свае рады ад асоб, парушаючых праграму, статут, дысцыпліну партыі.

4. Партыя на лютаўска-сакавіцкім пленуме ЦК 1937 года і студзеньскім пленуме ЦК 1938 года асудзіла практыку фармальных і бяздушна-бюракратычных адносін да пытання аб лёсе членаў партыі, аб выключэнні з партыі членаў партыі і аб аднаўленні выключаных членаў у партыі. Гэта практыка, як вядома, была шырока скарыстана пранікшымі ў партыю кар'ерысцкімі элементамі, стараўшыміся вызначыцца і вылучыцца на выключэннях з партыі, роўна як замаскіраванымі ворагамі ўнутры партыі, стараўшыміся шляхам шырокага правядзення мер рэпрэсіі перабіць чэсных членаў партыі і пасеяць залішнюю падазронасць у партыйных радах.

Студзеньскі пленум ЦК 1938 года прыняў рад мер, забяспечваючых ліквідацыю практыкі агульных выключэнняў з партыі, устанаўленне на справе дыферэнцыраванага падыходу пры рашэнні пытанняў аб выключэнні з партыі ці аб аднаўленні выключаных членаў у партыі.

У адпаведнасці з гэтым неабходна дапоўніць статут радам палажэнняў, якія павінны:

а) забяспечыць уважлівы падыход і дасканалы разгляд абгрунтаванасці абвінавачванняў, прад'яўленых члену партыі;

б) аградзіць правы членаў партыі ад усякага сваволля;

в) із'яць з практыкі прымяненне выключэння з партыі, з'яўляючагася вышэйшай мерай партыйнага пакарання, у адносінах да членаў партыі, зрабіўшых малаважныя праступкі.

5. Неабходна адмяніць статутнае патрабаванне к кандыдатам, уступаючым у партыю, згодна якога ўмовай іх прыёму ставіцца паміма **прызнання** праграмы і статута партыі і прахаджэння статутнага кандыдацкага стажа, таксама **ўсваенне** праграмы.

Таварыш Сталін у дакладзе на лютаўска-сакавіцкім пленуме ЦК 1937 года ўказваў:

«Каб усвоіць праграму партыі, трэба быць сапраўдным марксістам, правераным і тэарэтычна падрыхтаваным марксістам. Я не ведаю, ці многа знойдзецца ў нас членаў партыі, якія ўжо ўсвоілі нашу праграму, сталі сапраўднымі марксістамі, тэарэтычна падрыхтаванымі і праверанымі. Калі ісці далей па гэтаму шляху, то нам прыйшлося-б пакінуць у партыі толькі інтэлігентаў і наогул людзей вучоных. Каму патрэбна такая партыя? У нас ёсць правераная і вытрымаўшая ўсе выпрабаванні ленінская формула аб членстве ў партыі. Па гэтай формуле членам партыі лічыцца той, хто **прызнае** праграму партыі, плоціць членскія ўзносы і працуе ў адной з яе арганізацый. Звярніце ўвагу: у ленінскай формуле гаворыцца не аб **усваенні** праграмы, а аб **прызнанні** праграмы. Гэта дзве зусім розныя рэчы. Няма чаго і даказваць, што праў тут Ленін, а не нашы партыйныя таварышы, марна балбочучыя аб усваенні праграмы. Яно і зразумела. Калі-б партыя выходзіла з таго, што членамі партыі могуць быць толькі такія таварышы, якія ўжо ўсвоілі праграму і сталі тэарэтычна падрыхтаванымі марксістамі, то яна не стварала-б у партыі тысячы партыйных гурткоў, сотні партыйных школ, дзе членаў партыі абучаюць марксізму і дапамагаюць ім усвоіць нашу праграму. Зусім ясна, што калі партыя арганізоўвае такія школы і гурткі сярод членаў партыі, то гэта таму, што яна ведае, што члены партыі не паспелі яшчэ ўсвоіць партыйную праграму, не паспелі яшчэ стаць тэарэтычна падрыхтаванымі марксістамі».

Па гэтых матывах неабходна адмяніць указанае статутнае патрабаванне.

6. Новыя задачы партыі, узнікшыя ў сувязі з паваротам у палітычным жыцці краіны, з прыняццем новай Канстытуцыі Саюза ССР, патрабавалі ад партыі адпаведнай перабудовы практыкі партыйнай работы на аснове безумоўнага і поўнага правядзення ў жыццё пачаткаў унутрыпартыйнага дэмакратызма, прадпісваемага статутам партыі. У гэтых мэтах партыя ліквідавала меўшае месца ў практыцы партыйнай работы парушэнне асноў дэмакратычнага цэнтралізма і аднавіла, у адпаведнасці са статутам партыі, выбарнасць кіруючых органаў партыйных арганізацый.

Партыя правяла таксама рад дадатковых мер, забяспечваючых правядзенне паслядоўнай дэмакратычнай практыкі, а іменна: адмена практыкі каптацыі, забарона пры выбарах партыйных органаў галасавання спіскам, пераход да галасавання па асобных кандыдатурах, забеспячэнне за ўсімі членамі партыі неабмежаванага права адводу кандыдатаў і крытыкі апошніх, устанаўленне пры выбарах партыйных органаў закрытага (тайнага) галасавання кандыдатаў, устанаўленне абавязковасці перыядычнага склікання гарадскіх партыйных актываў, а ў вялікіх гарадах — таксама і раённых актываў.

Статут павінен адлюстраваць гэтыя новыя мерапрыемствы партыі, правераныя практыкай, забяспечыўшыя далейшае развіццё крытыкі і самакрытыкі, пад'ём адказнасці партыйных органаў перад партыйнай масай, рост актыўнасці партыйнай масы, і тым самым спрыяўшыя ўзбраенню партыі для паспяховага вырашэння новых задач палітычнага кіраўніцтва.

7. Згодна статута партыі для практычнай работы па ажыццяўленню партыйных рашэнняў і пастаноў (і праверкі іх выканання савецка-гаспадарчымі органамі і ніжэйшымі партыйнымі арганізацыямі) у абкомах, крайкомах, ЦК нацкомпартый і ЦК ВКП(б) павінны існаваць цэласныя вытворча-галінныя аддзелы, прычым «у кожным вытворча-галінным аддзеле сканцэнтроўваецца ўся работа ў цэлым па данай галіне: оргпартработа, размеркаванне і падрыхтоўка кадраў, агітмасработа, вытворчая прапаганда, нагляд за выкананнем партыйных рашэнняў адпаведнымі савецка-гаспадарчымі органамі і партыйнымі арганізацыямі».

Практыка паказала, аднак, што такая арганізацыя партыйнага апарата аказалася недастатковай.

Цэнтральнай арганізацыйнай задачай партыі за прайшоўшы перыяд і ў даны момант была і астаецца задача правільнага падбору людзей і праверкі выканання. Гэтаму пытанню надаваў выключнае значэнне Ленін, указваючы на XI з'ездзе партыі:

«Мы прыйшлі к таму, што гвозд становішча — у людзях, у падборы людзей... Падбірайце патрэбных людзей і правярайце практычнае выкананне, — і гэта народ ацэніць».

У сваім дакладзе на XVII з'ездзе партыі таварыш Сталін з усёй сілай падкрэсліў значэнне правільнага падбору людзей і праверкі выканання, гаворачы:

«Перамога ніколі не прыходзіць сама, — яе звычайна прыцягваюць. Добрыя рэзалюцыі і дэкларацыі за генеральную лінію партыі — гэта толькі пачатак справы, бо яны азначаюць толькі жаданне перамагчы, але не самую перамогу. Пасля таго, як дана правільная лінія, пасля таго, як дано правільнае рашэнне пытання, поспех справы залежыць ад арганізацыйнай работы, ад арганізацыі барацьбы за правядзенне ў жыццё лініі партыі, ад правільнага падбору людзей, ад праверкі выканання рашэнняў кіруючых органаў. Без гэтага правільная лінія партыі і правільныя рашэнні рыскуюць пацярпець сур'ёзны ўшчэрб. Больш таго: пасля таго, як дана правільная палітычная лінія, арганізацыйная работа рашае ўсё, у тым ліку і лёс самой палітычнай лініі, — яе выкананне, або яе правал».

Вопыт паказаў, што слабасці нашай арганізацыйнай работы па падбору людзей і праверцы выканання да гэтага часу не пераадолены. Распыленне справы падбору кадраў паміж вытворча-галіннымі аддзеламі прывяло да зніжэння размаху арганізацыйнай работы, затрудніла неабходнае перасоўванне работнікаў з адной галіны ў другую, вылучэнне людзей, мэтазгоднае скарыстанне іх на тых участках, якія ў даны момант прадстаўляюць асобую важнасць для партыі. Распыленне справы падбору кадраў па розных вытворча-галінных аддзелах партыйнага апарата стала прамым тормазам паспяховага вырашэння задачы падбору і размеркавання кадраў. Гэта задача патрабуе накіравання ўсёй работы па кадрах з адзінага цэнтра шляхам канцэнтрацыі гэтай работы ў адзіным апараце, дзе павінны быць сканцэнтраваны вопыт па падбору кадраў, справа вывучэння кадраў, вопыт па іх расстаноўцы.

ЦК ВКП(б), улічваючы такое становішча, прыняў рад мер, сканцэнтраваўшы справу падбору кадраў у Аддзеле кіруючых партарганаў (АКПО ЦК). Прымаючы, аднак, пад увагу першаступенную важнасць справы падрыхтоўкі і падбору кадраў і вялікі аб'ём гэтай работы, належала-б рэарганізаваць АКПО, выдзеліўшы работу па кадрах усіх галін работы ў самастойнае Упраўленне кадраў, а пытанні партыйна-арганізацыйнага кіраўніцтва—у спецыяльны Арганізацыйна-інструктарскі аддзел.

8. Недастатковай аказалася таксама практыка распылення праверкі выканання партыйных дырэктыў паміж рознымі вытворча-галіннымі аддзеламі. Гэту работу неабходна таксама канцэнтраваць у адным месцы, змяніўшы, у адпаведнасці з гэтым, характар дзейнасці КПК. Цэнтральнай задачай КПК павінна стаць задача ўмацнення кантроля за выкананнем рашэнняў ЦК ВКП(б) і арганізацыі сістэматычнай праверкі работы мясцовых арганізацый. Неабходна ўстанавіць, што КПК працуе пры ЦК ВКП(б). У сувязі з гэтым адпадае неабходнасць выбараў КПК непасрэдна на З'ездзе партыі. Камісія партыйнага кантроля павінна выбірацца пленумам Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) і працаваць пад кіраўніцтвам і па дырэктывах ЦК ВКП(б).

9. Задача ліквідацыі тэарэтычнай і палітычнай адсталасці партыйных кадраў, задача ўзбраення членаў партыі марксісцка-ленінскай тэорыяй і авалодання большэвізмам патрабуе падняцця на належны ўзровень справы партыйнай прапаганды і агітацыі, у адпаведнасці з рашэннем ЦК «Аб пастаноўцы партыйнай прапаганды ў сувязі з выпускам «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)».

ЦК ВКП(б) павінен мець магутны апарат прапаганды і агітацыі ў выглядзе Упраўлення прапаганды і агітацыі, які сканцэнтроўвае ўсю работу па друкаванай і вуснай прапагандзе і агітацыі.

10. Вытворча-галінныя аддзелы ЦК ВКП(б) павінны быць ліквідаваны, за выключэннем Сельскагаспадарчага аддзела, з прычыны асобай важнасці задачы кантроля і нагляду за дзейнасцю савецкіх і партыйных арганізацый у галіне сельскай гаспадаркі, і Аддзела школ, які павінен кантраліраваць пастаноўку справы народнай асветы ва ўсіх рэспубліках.

У абкомах, крайкомах і ЦК нацкомпартый павінны быць створаны аддзелы: Кадраў, Прапаганды і агітацыі, Арганізацыйна-інструктарскі і Сельскагаспадарчы і скасаваны ўсе астатнія вытворча-галінныя аддзелы.

У райкомах і гаркомах неабходна мець аддзелы: Кадраў, Прапаганды і агітацыі і Арганізацыйна-інструктарскі.

Кіраўніцтва аддзеламі Прапаганды і агітацыі і аддзеламі Кадраў у абкомах, крайкомах і ЦК нацкомпартый павінна быць ускладзена на асобых сакратароў.

11. Ва ўмовах быстрага ўздыму сацыялістычнай гаспадаркі, быстрага палітычнага і культурнага росту рабочых, сялян і інтэлігенцыі рэзка павысіўся тэмп партыйнага і дзяржаўнага жыцця. Для таго, каб ажыццяўляць кіраўніцтва дзяржаўнымі і партыйнымі справамі, быстра рэагіраваць на запатрабаванні, высоўваемыя жыццём, і своечасова вырашаць назрэўшыя пытанні, неабходна дапоўніць існуючую схему цэнтральных арганізацый партыі—З'езд партыі, ЦК ВКП(б)—новым органам, — Усесаюзнай партыйнай канферэнцыяй. Гэта тым больш неабходна, што вялікі прамежак часу паміж з'ездамі партыі абмяжоўвае магчымасць вылучэння на кіруючую работу, і ў асаблівасці ў ЦК ВКП(б), выраслых кадраў работнікаў партыі, а канферэнцыя магла-б даць партыі такую магчымасць. У сувязі з гэтым назрэла неабходнасць дапоўніць схему цэнтральных арганізацый партыі — З'езд партыі, ЦК ВКП(б) — Усесаюзнай канферэнцыяй партыі, склікаемай не радзей аднаго разу ў год з прадстаўнікоў мясцовых арганізацый, з тым, каб галоўнай задачай Усесаюзнай канферэнцыі партыі лічыць абмеркаванне назрэўшых пытанняў палітыкі партыі.

Усесаюзнай канферэнцыі партыі трэба прадаставіць права замены часткі членаў ЦК, гэта значыць права вываду з састава ЦК асобных членаў ЦК, не забяспечваючых выканання імі сваіх абавязкаў, як членаў ЦК, і замены іх іншымі, але ў колькасці не больш адной пятай састава ЦК, выбранага З'ездам партыі. Канферэнцыя папаўняе састаў членаў ЦК з ліку кандыдатаў, выбраных З'ездам партыі, і ўзамен іх выбірае адпаведную колькасць новых кандыдатаў у члены ЦК.

Рашэнні канферэнцыі, за выключэннем рашэння аб замене членаў ЦК і выбранні новых кандыдатаў у члены ЦК, не маючага патрэбы ў зацвярджэнні ЦК ВКП(б), падлягаюць зацвярджэнню ЦК ВКП(б). Рашэнні канферэнцыі, зацверджаныя ЦК ВКП(б), з'яўляюцца абавязковымі для ўсіх партыйных арганізацый. Дэлегаты канферэнцыі выбіраюцца на пленумах абкомаў, крайкомаў і ЦК нацкомпартый. Члены ЦК, калі яны не з'яўляюцца дэлегатамі па поўнамоцтву ад мясцовых арганізацый, удзельнічаюць у работах канферэнцыі з правам дарадчага голасу.

12. За прайшоўшы перыяд на аснове ўздыму партыйна-палітычнай і партыйна-арганізацыйнай работы ўмацаваліся пярвічныя партарганізацыі, палепшылася іх сувязь з масамі, павысілася авангардная роля комуністаў, падняўся ўзровень партыйнага жыцця. Партыйныя арганізацыі бліжэй падыйшлі да практычных пытанняў гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Вопыт паказаў, што паспяховая работа партыйных арганізацый была забяспечана там, дзе пярвічная партыйная арганізацыя здолела спалучыць партыйна-палітычную работу з барацьбой за паспяховае выкананне вытворчых планаў, за паляпшэнне работы дзяржаўнага апарата, за асваенне новай тэхнікі, за ўмацаванне працоўнай дысцыпліны з разгортваннем стаханаўскага руху, з вылучэннем на партыйна-гаспадарчую работу новых кадраў. І наадварот, там, дзе партыйныя арганізацыі адышлі ў бок ад гаспадаркі, абмежаваўшы свае задачы агітацыяй, або там, дзе партыйныя арганізацыі прынялі на сябе не ўласцівыя ім функцыі кіраўніцтва гаспадаркай, падмяняючы і абязлічваючы гаспадарчыя органы, там работа немінуча пападала ў тупік.

У цяперашні час назрэла неабходнасць больш дакладна вызначыць задачы рознага тыпу пярвічных партыйных арганізацый і ў прыватнасці такіх розных тыпаў пярвічных партыйных арганізацый, як партыйная арганізацыя на вытворчасці (фабрыка, завод, соўгас, калгас) і партыйная арганізацыя Наркамата. Партыйнай арганізацыі вытворчага тыпу (фабрычна-заводскай, соўгаса, калгаса) павінна быць прадастаўлена права кантроля за станам спраў прадпрыемства, соўгаса ці калгаса. Гэта павінна прывесці да ўзмацнення ролі і адказнасці пярвічных партыйных арганізацый на вытворчасці. Што датычыць партыйных арганізацый Наркаматаў, то яны, не маючы, у сілу спецыфічных умоў функцый кантроля, павінны ўзмацніць сваю ролю ў справе паляпшэння работы дзяржаўнага апарата. Наркамацкія партыйныя арганізацыі абавязаны сігналізіраваць аб недахопах работы таго ці іншага Наркамата, адзначаць недахопы асобных работнікаў і паведамляць аб іх у ЦК і кіраўнікам Наркамата.

Усе члены партыі, працуючыя ў тым ці іншым Наркамаце, павінны аб'ядноўвацца агульнанаркамацкай партыйнай арганізацыяй. Сакратар пярвічнай арганізацыі Наркамата павінен зацвярджацца ЦК ВКП(б).

XVIII З'езд ВКП(б) пастанаўляе ўнесці ў статут ВКП(б) наступныя асноўныя змяненні і дапаўненні:

I.

Аб членах партыі і іх правах і абавязках.

1. Адмяніць існуючыя катэгорыі пры прыёме з кандыдатаў у члены партыі і ўстанавіць адзіны парадак прыёму з кандыдатаў у члены партыі для рабочых, сялян і інтэлігенцыі. Усе ўступаючыя ў партыю абавязаны прадставіць рэкамендацыі трох членаў партыі з трохгадовым партыйным стажам, ведаючых іх па сумеснай рабоце не менш аднаго года. Для выхадцаў з іншых партый захаваць зараз дзеючыя статутныя правілы. Рашэнне пярвічнай партыйнай арганізацыі аб прыёме ў партыю ўступае ў сілу па зацвярджэнні яго райкомам ці гаркомам.

2. Дапоўніць раздзел аб членах партыі і іх абавязках пунктам аб правах членаў партыі, уключыўшы:

а) права членаў партыі крытыкаваць на партыйных сходах любога работніка партыі;

б) права членаў партыі выбіраць і быць выбранымі ў партыйныя органы;

в) права членаў партыі патрабаваць асабістага ўдзелу ва ўсіх выпадках, калі выносіцца рашэнне аб іх дзейнасці або паводзінах;

г) права членаў партыі звярачацца з любым пытаннем і заявай у любую партыйную інстанцыю аж да ЦК ВКП(б).

3. Адмяніць перыядычныя масавыя чысткі партыі, устанавіўшы, што партыя можа ў звычайным парадку ачышчаць свае рады ад асоб, парушаючых праграму партыі, статут партыі, дысцыпліну партыі.

4. Устанавіць, што пры рашэнні пытанняў аб выключэнні з партыі або аднаўленні выключаных у правах членаў партыі павінен быць забяспечаны максімум асцярожнасці і таварыскіх клопатаў і старанны разгляд абгрунтаванасці абвінавачванняў, прад'яўленых члену партыі, і што за дробныя праступкі (няяўка на сход, неўплата ў тэрмін членскіх узносаў) павінны прымяняцца прадугледжаныя статутам меры партыйнага выхавання і ўздзеяння, а не выключэнне з партыі, з'яўляючаеся вышэйшай мерай партыйнага пакарання.

5. Рашэнне пярвічнай партыйнай арганізацыі аб выключэнні з партыі, а таксама аб аднаўленні выключаных у правах членаў партыі набывае сілу толькі ў тым выпадку, калі яно зацвярджаецца абкомам (крайкомам) партыі.

6. Апеляцыі выключаных з партыі павінны разглядацца адпаведнымі партыйнымі органамі не пазней, чым у двухтыднёвы тэрмін.

7. Адмяніць статутнае патрабаванне к кандыдатам, у сілу якога таварышы, прайшоўшыя кандыдацкі стаж, прызнаючыя праграму партыі і падпарадкоўваючыеся яе статуту і дысцыпліне, усё-ж не могуць лічыцца членамі партыі, пакуль яны не ўсвояць праграму партыі, г. зн. пакуль яны не стануць марксісцка адукаванымі партыйцамі.

II.

Аб кандыдатах у члены партыі.

8. Прывесці раздзел аб кандыдатах у члены партыі ў адпаведнасць з раздзелам аб членах партыі (адмена катэгорый па прыёму).

9. Устанавіць агульны для рабочых, сялян і інтэлігенцыі кандыдацкі стаж тэрмінам у адзін год.

10. Для выхадцаў з іншых партый захаваць зараз дзеючыя статутныя правілы.

III.

Аб арганізацыйнай будове партыі.

11. Уключыць у статут наступныя дадатковыя палажэнні, выцякаючыя з задач правядзення ў партыі паслядоўнай дэмакратычнай практыкі і ажыццяўлення да канца асноў дэмакратычнага цэнтралізма:

а) забараніць пры выбарах партыйных органаў галасаванне спіскам. Галасаванне праводзіць па асобных кандыдатурах, забяспечваючы пры гэтым за ўсімі членамі партыі неабмежаванае права адводу кандыдатаў і крытыкі апошніх;

б) устанавіць пры выбарах партыйных органаў закрытае (тайнае) галасаванне кандыдатаў.

12. Улічваючы асобае палітычнае значэнне партыйнага актыва ў жыцці партыі, дапоўніць статут наступным пунктам аб актывах гарадскіх арганізацый:

Лічыць неабходным, каб ва ўсіх без выключэння рэспубліканскіх, краявых і абласных цэнтрах, а таксама ва ўсіх, больш ці менш значных прамысловых цэнтрах абавязкова склікаліся актывы гарадскіх партыйных арганізацый для абмеркавання важнейшых рашэнняў партыі і ўрада, каб актывы скліваліся не для парада і фармальна-ўрачыстага адабрэння гэтых рашэнняў, а для сапраўднага іх абмеркавання, каб у вялікіх цэнтрах скліваліся не толькі гарадскія, але і раённыя партыйныя актывы.

13. Ліквідаваць у ЦК ВКП(б) вытворча-галінныя аддзелы, за выключэннем Сельскагаспадарчага аддзела і Аддзела школ.

Мець у ЦК ВКП(б) наступныя ўпраўленні і аддзелы:

а) Упраўленне кадраў;

б) Упраўленне прапаганды і агітацыі;

в) Арганізацыйна-інструктарскі аддзел;

г) Сельскагаспадарчы аддзел;

д) Аддзел школ.

У абкомах, крайкомах і ЦК нацкомпартый ствараюцца:

а) Аддзел кадраў;

б) Аддзел прапаганды і агітацыі;

в) Арганізацыйна-інструктарскі аддзел;

г) Сельскагаспадарчы аддзел.

У гаркомах і райкомах ствараюцца:

а) Аддзел кадраў;

б) Аддзел прапаганды і агітацыі;

в) Аддзел арганізацыйна-інструктарскі.

14. У змяненне існуючага статутнага парадку ўстанавіць, што Камісія партыйнага кантроля выбіраецца пленумам ЦК і працуе пад кіраўніцтвам ЦК ВКП(б).

Камісія партыйнага кантроля:

а) кантраліруе выкананне дырэктыў ЦК ВКП(б) савецка-гаспадарчымі органамі і партыйнымі арганізацыямі;

б) правярае работу мясцовых партыйных арганізацый;

в) прыцягвае да адказнасці вінаватых у парушэнні праграмы і статута ВКП(б) і партыйнай дысцыпліны.

15. Кіраўніцтва аддзеламі прапаганды і агітацыі і аддзеламі кадраў у абкомах, крайкомах і ЦК нацкомпартый павінна быць ускладзена на асобых сакратароў.

Працяг на 3-й стар.

Працяг тэзісаў даклада тав. А. ЖДАНАВА

IV.

Аб цэнтральных арганізацыях партыі.

16. Дапоўніць статут ВКП(б) наступнымі палажэннямі аб Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі:

а) Усесаюзная канферэнцыя склікаецца з прадстаўнікоў мясцовых арганізацый для абмеркавання назрэўшых пытанняў палітыкі партыі;

б) Усесаюзная канферэнцыя склікаецца не радзей аднаго разу ў год;

в) дэлегаты Усесаюзнай канферэнцыі выбіраюцца на пленумах абкомаў, крайкомаў, ЦК нацкомпартый;

г) парадак выбараў і нормы прадстаўніцтва на Усесаюзную канферэнцыю ўстанаўліваюцца ЦК ВКП(б);

д) Усесаюзнай канферэнцыі прадастаўляецца права замяняць частку членаў ЦК, гэта значыць права выводзіць з састава ЦК асобных членаў ЦК, не забяспечваючых выканання імі сваіх абавязкаў, як членаў ЦК і замяняць іх іншымі, але ў колькасці не больш адной пятай састава ЦК, выбранага З'ездам партыі. Усесаюзная канферэнцыя папаўняе састаў членаў ЦК з ліку кандыдатаў, выбраных З'ездам партыі, і ўзамен іх выбірае адпаведную колькасць новых кандыдатаў у члены ЦК;

е) рашэнні Усесаюзнай канферэнцыі, за выключэннем рашэння аб замене членаў ЦК і выбранні новых кандыдатаў у члены ЦК, не маючага патрэбы ў зацвярджэнні ЦК ВКП(б), падлягаюць зацвярджэнню ЦК ВКП(б). Рашэнні Усесаюзнай канферэнцыі, зацверджаныя ЦК ВКП(б), з'яўляюцца абавязковымі для ўсіх партыйных арганізацый;

ж) члены ЦК, калі яны не з'яўляюцца дэлегатамі па паўнамоцтву ад мясцовых арганізацый, удзельнічаюць у работах Усесаюзнай канферэнцыі з правам дарадчага голасу.

V.

Аб партыйным стажы для сакратароў абкомаў, гаркомаў, райкомаў і начальнікаў палітаддзелаў Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

17. У мэтах стварэння неабходных умоў для вылучэння на кіруючую партыйную работу новых кадраў партыйных работнікаў, у змяненне адпаведных параграфаў статута, устанавіць партыйны стаж для сакратароў абкомаў, крайкомаў, ЦК нацкомпартый замест 12 год не менш 5 год, для сакратароў гаркомаў замест 10 год не менш 3 год, для сакратароў райкомаў замест 7 год не менш 3 год і для сакратароў пярвічных партыйных арганізацый і цэхпарторгаў замест стажу ў першым выпадку не менш 3 год, а ў другім не менш 2 год, устанавіць партыйны стаж не менш 1 года.

Для начальнікаў палітупраўленняў акруг, флотаў і армій лічыць абавязковым замест 10-гадовага — 5-гадовы партыйны стаж і для начальнікаў палітаддзелаў дывізій і брыгад замест 6-гадовага — 3-гадовы партыйны стаж.

VI.

Аб краявых—абласных—рэспубліканскіх арганізацыях партыі.

18. Устанавіць, што ў абкомах, крайкомах і ЦК нацкомпартый павінна быць 4—5 сакратароў, у тым ліку першы сакратар, другі сакратар, сакратар па кадрах і сакратар па прапагандзе.

VII.

Аб акруговых арганізацыях партыі.

19. Прадаставіць акруговым партыйным арганізацыям статутныя правы, дапоўніўшы статут ВКП(б) адпаведным палажэннем.

VIII.

Аб партарганізацыях у Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскім Флоце.

20. У сувязі са стварэннем Наркамата Ваенна-Марскога Флота распаўсюдзіць статутнае палажэнне аб партыйных арганізацыях у Чырвонай Арміі таксама на партарганізацыі Ваенна-Марскога Флота, устанавіўшы, што Палітычнае Упраўленне Ваенна-Марскога Флота працуе на правах Ваенна-Марскога Аддзела ЦК ВКП(б).

IX.

Аб пярвічных партыйных арганізацыях.

21. Для павышэння ролі пярвічных партыйных арганізацый вытворчых прадпрыемстваў, у тым ліку саўгасаў і калгасаў, і іх адказнасці за стан работы прадпрыемстваў, прадаставіць гэтым арганізацыям права кантроля работы адміністрацыі прадпрыемства.

Наркамацкія партыйныя арганізацыі, якія, у сілу асобых умоў работы савецкіх устаноў, функцыямі кантроля карыстацца не могуць, абавязаны сігналізіраваць аб недахопах у рабоце ўстановы, адзначаць недахопы ў рабоце Наркамата і яго асобных работнікаў і накіроўваць свае матэрыялы і меркаванні ў ЦК ВКП(б) і кіраўнікам Наркамата.

Сакратары наркамацкіх партыйных арганізацый зацвярджаюцца ЦК ВКП(б).

Усе камуністы — работнікі цэнтральнага апарата Наркамата ўваходзяць у адну агульнанаркамацкую партыйную арганізацыю.

22. У змяненне існуючага палажэння іменаваць надалей выбарныя органы пярвічных партыйных арганізацый не камітэтамі, а бюро (бюро такой-та партыйнай арганізацыі).

23. Бюро пярвічных партарганізацый ствараюцца ў партарганізацыях, налічваючых не менш 15 членаў партыі.

24. У мэтах быстрага вырошчвання і выхавання членаў партыі ў духу калектыўнага кіраўніцтва прадаставіць права цэхавым партыйным арганізацыям, налічваючым не менш 15, але не больш 100 членаў партыі, выбіраць бюро цэхавай партыйнай арганізацыі ў саставе ад 3 да 5 чалавек, а налічваючым звыш 100 членаў партыі — ад 5 да 7 чалавек.

НАСУСТРАЧ XVIII З'ЕЗДУ ВКП(б)

АПРАЎДАЕМ ВЫСОКАЕ ЗВАННЕ МАСТАКА

5 лютага адбыўся агульны сход мастакоў гор. Менска, прысвечаны надыходзячаму XVIII з'езду ВКП(б).

— Тэзісы дакладаў таварышоў Молатава і Жданава,—заявілі мастакі,—увасабляюць буйнейшыя перамогі сацыялізма і натхняюць кожнага мастака на стварэнне вялікіх твораў, славячых гераічны шлях, пройдзены савецкім народам і яго партыяй у барацьбе за перамогі камунізма.

— Я ўсхваляван той увагай,—сказаў засл. дзеяч маст. тав. Азгур, — якая адводзіцца ў тэзісах таварышоў Молатава і Жданава нашай інтэлігенцыі, а таксама змяненнямі статута партыі. Я буду працаваць так, каб з маімі творамі не сорамна было прыйсці і сказаць, што я варты заявіць аб прыняцці мяне ў рады бальшэвіцкай партыі.

— Апраўдаем высокае званне мастака,—заявіў у сваім выступленні засл. дзеяч маст. тав. Бембель.—Будзем працаваць у трэцяй сталінскай пяцігодцы так, каб узняць сябе да ўзроўню лепшых мастакоў братніх рэспублік.

— Мы жывём у шчаслівую эпоху,—заявіў засл. дзеяч маст. тав. Грубэ. — Роля чалавека ўзнята на нябачаную вышыню. І ўсё гэта дзякуючы партыі Леніна—Сталіна. Я далучаюся да заявы тав. Азгура — я таксама хачу прыйсці да выстаўкі 1940 года з такімі работамі, каб быць вартым падаць заяву аб прыёме мяне ў рады камуністычнай партыі.

Засл. дзеяч маст. тав. Керзін заклікае мастакоў азнаменаваць гэты год новым уздымам творчай работы.—Пад кіраўніцтвам нашага геніяльнага правадыра таварыша Сталіна мы, беларускія мастакі, створым да выстаўкі 1940 года творы, вартыя нашай вялікай сталінскай эпохі.

Тт. Азгур, Бембель, Грубэ, Пашкевіч, Зайцаў бяруць на сябе канкрэтныя абавязацельствы па падрыхтоўцы да выстаўкі 1940 года «Ленін і Сталін—арганізатары беларускай дзяржаўнасці», па афармленню беларускага павільёна Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі.

Тав. Бразэр бярэ на сябе абавязацельства закончыць да XVIII з'езда партыі скульптуру таварыша Сталіна, над якой ён зараз працуе.

Прысутнічаўшы на сходзе член саюза мастакоў Масквы тав. Мадораў узяў на сябе абавязацельства дапамагчы маладым мастакам БССР лепш падрыхтавацца да выстаўкі 1940 года.

Сустрэнем XVIII з'езд партыі новымі перамогамі

3-га лютага ў Дзяржфілармоніі адбыўся мітынг, прысвечаны сустрэчы XVIII з'езда ВКП(б). У сваёй інфармацыі аб з'ездзе дырэктар Філармоніі тав. Прагін заклікаў калектыў сустрэць з'езд партыі новымі творчымі перамогамі. Выступіўшыя работнікі Філармоніі тт. Шэр, Салабуцін, Навіцкі, Акулёнак і інш. гаварылі аб велізарным значэнні XVIII з'езда партыі ў гісторыі нашай краіны, аб неабходнасці ліквідаваць недахопы ў рабоце Філармоніі.

У азнаменаванне XVIII з'езда ВКП(б) у Філармоніі разгарнулася сацыялістычнае спаборніцтва паміж калектывамі. Аркестр народных інструментаў, хор, ансамбль песні і пляскі ўзялі на сябе сацыялістычныя абавязацельствы: вывучыць матэрыялы XVIII з'езда ВКП(б), датэрмінова выканаць квартальны план творчай работы, падрыхтаваць звыш плана новыя песні і пляскі, вылучыць некалькі работнікаў Філармоніі на дапамогу мастацкай самадзейнасці, падрыхтаваць 20 варашылаўскіх стралкоў, арганізаваць канцэрт у дапамогу іспанскім дзецям і г. д.

Калектыў Філармоніі ў гуртках бягучай палітыкі прыступіў да вывучэння тэзісаў дакладаў таварышоў Молатава і Жданава.

Адлюструем у сваіх творах вобразы геніяльных людзей нашай эры

Работнікі Яўрэйскага Дзяржаўнага тэатра сустрэлі паведамленне аб скліканні XVIII з'езда партыі з вялікім уздымам. Выступаўшыя на мітынгу артысты тэатра выказалі аднадушнае імкненне калектыва прыйсці да XVIII з'езда партыі з новымі поспехамі.

У сваёй рэзалюцыі работнікі тэатра абавязаліся ў азнаменаванне з'езда ўзняць ідэйна-творчую работу на большую вышыню, стварыць спектаклі, вартыя сталінскай эпохі, адлюстраваць у сваіх творах вобразы геніяльных людзей нашай эры—Леніна і Сталіна.

У калектыве разгарнулася сацыялістычнае спаборніцтва. Артысты тэатра тт. Моін, Олендэр, Трэпель, Левін і інш. узялі на сябе рад абавязацельстваў па выпуску новай пастаноўкі «Гершэле Остраполер», па стварэнню мастацка поўнакаштоўных рэалістычных спектакляў.

ЛЕКЦЫІ ПА ГІСТОРЫІ ПАРТЫІ ДЛЯ РАБОТНІКАЎ МАСТАЦТВАЎ

Аддзелы агітацыі і прапаганды Менскага абкома і гаркома КП(б)Б арганізуюць для работнікаў мастацтваў сталіцы БССР цыкл лекцый па вывучэнню гісторыі ВКП(б). Лекцыі будуць чытацца сістэматычна тры разы ў месяц. Першая лекцыя праф. Пухоўскага на тэму «Дыялектычны матэрыялізм» прачытана ўжо 29 студзеня ў Доме партасветы. Работнікі мастацтваў праявілі да лекцыі праф. Пухоўскага велізарную зацікаўленасць.

ПАСТАНОВЫ ЦК ВКП(б)

I.

АБ ПРАВЯДЗЕННІ СХОДАЎ ПЯРВІЧНЫХ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ, РАЁННЫХ, ГАРАДСКІХ, КРАЯВЫХ ПАРТКАНФЕРЭНЦЫЙ І З'ЕЗДАЎ НАЦКОМПАРТЫЙ, У СУВЯЗІ СА СКЛІКАННЕМ XVIII З'ЕЗДА ВКП(б)

1. У перыяд з 1 лютага па 1 сакавіка 1939 года правесці:

а) Закрытыя сходы пярвічных партыйных арганізацый для выбараў дэлегатаў на раённыя і гарадскія партканферэнцыі;

б) Раённыя і гарадскія партканферэнцыі для выбараў дэлегатаў на абласныя, краявыя партканферэнцыі і з'езды нацкомпартый саюзных рэспублік, не маючых абласнога дзялення;

в) Абласныя, краявыя партканферэнцыі і з'езды нацкомпартый саюзных рэспублік, не маючых абласнога дзялення, для выбараў дэлегатаў на XVIII з'езд ВКП(б).

2. Выбары дэлегатаў на партыйныя канферэнцыі, дэлегатаў на XVIII з'езд ВКП(б) правесці шляхам закрытага (тайнага) галасавання.

3. У гарадскіх партарганізацыях, маючых раённае дзяленне, выбары дэлегатаў на абласныя, краявыя партканферэнцыі і з'езды нацкомпартый правесці на раённых партыйных канферэнцыях.

4. На сходах пярвічных партарганізацый, раённых, гарадскіх, абласных, краявых партканферэнцыях і з'ездах нацкомпартый абмеркаваць тэзісы па дакладу тав. Молатава аб трэцім пяцігадовым плане развіцця народнай гаспадаркі СССР і тэзісы па дакладу тав. Жданава аб змяненнях у статуце ВКП(б).

II.

АБ АБМЕРКАВАННІ ТЭЗІСАЎ К XVIII ПАРТЫЙНАМУ З'ЕЗДУ.

1. Тэзісы па дакладу тав. Молатава — «Трэці пяцігадовы план развіцця народнай гаспадаркі СССР» (2-гі пункт парадку дня з'езда) і па дакладу тав. Жданава—«Змяненні ў статуце ВКП(б)» (3-ці пункт парадку дня з'езда)—паставіць на абмеркаванне партыйных сходаў і ў друку.

2. Пры «Праўдзе» выдаць «Дыскусійны лісток», у якім друкаваць крытычныя артыкулы, папраўкі і канкрэтныя прапановы к тэзісам.

(«ПРАВДА»).

ПІСЬМЕННІКІ-ОРДЭНАНОСЦЫ

М. КЛІМКОВІЧ

Савецкая беларуская літаратура за апошнія годы дасягнула небывалых поспехаў: нарадзіліся новыя таленавітыя кадры, набылі сталасць і майстэрства маладыя пісьменнікі, разгарнулася і расцвіла творчасць старэйшага пакалення пісьменнікаў. Партыя і ўрад высока ацанілі рост нашай літаратуры, узнагародзіўшы сем лепшых пісьменнікаў БССР ордэнамі. Гэта высокая ўзнагарода ўспрынята нашай літаратурнай грамадскасцю ў першую чаргу як стымул да ўпартай працы над новымі творамі, над актуальнай тэматыкай, да працы над вобразам, над мастацкім словам. У гэтым сэнсе работа зараз узнагароджаных пісьменнікаў з'яўляецца прыкладам для ўсіх пісьменнікаў БССР. Кожны з іх у сваёй галіне, сваімі мастацкімі сродкамі, у меру сваіх сіл многа і ўпарта працаваў над уздымам беларускай літаратуры на новую, больш высокую ступень.

Хто не зачытваўся творамі дарэвалюцыйных Купалы і Коласа? Адны з заснавальнікаў сучаснай нам беларускай літаратуры, Янка Купала і Якуб Колас вось ужо трыццаць чатыры годы з непахіснай энергіяй працуюць на літаратурнай ніве. Яны прышлі ў літаратуру тады, калі не было яшчэ ўстанавіўшайся літаратурнай мовы, не было сталай граматыкі беларускай мовы, калі літаратуру заядала бытаўшчына, калі народная творчасць не была асвоена беларускімі пісьменнікамі.

Янка Купала і Якуб Колас першымі паказалі прыклад таго, як трэба скарыстоўваць народную творчасць у літаратурным творы. Яны адбіралі з народнай творчасці яе найбольш дэмакратычныя, найбольш рэвалюцыйныя элементы: сюжэты, вобразы, пагаворкі і казкі, накіраваныя супроць царскага і панскага прыгнёту, супроць папоўцемрашалаў. Яны творча скарыстоўвалі гэтыя элементы народнай творчасці, вучачыся на прыкладах рускай і украінскай паэзіі, паэзіі Пушкіна, Някрасава, Лермантава, Шаўчэнка, прыбліжаючы гэтым самым літаратуру к шырокім масам, робячы яе сваёй, роднай, зразумелай. Барацьба за рэвалюцыйна-дэмакратычныя патрабаванні сялянства была зместам творчасці Купалы і Коласа.

Мова мас — вось тая форма, якая можа хутчэй за ўсё і лягчэй за ўсё данесці гэтыя ідэі ў народ. І Купала, і Колас авалодваюць гэтай формай, арганічна зліваюць яе з рэвалюцыйным зместам сваіх твораў. Гэтым яны пракладваюць шляхі для далейшага развіцця беларускай літаратуры і ў гэтым іх вялікая заслуга перад сучаснай беларускай літаратурай.

Добра ведаючы народную мову, яе законы, яе багацце, Купала і Колас павярнулі літаратуру на шлях адзінай літаратурнай мовы замест разнабою дыялектаў, на якіх пісаліся літаратурныя творы да таго часу. Іх творчасць стала фундаментам у стварэнні літаратурнай мовы. У гэтым іх другая заслуга перад літаратурай, перад народам.

Уводзячы новыя разнастайнейшыя формы вершаскладання, шырока карыстаючыся вопытам рускай і украінскай літаратур, Янка Купала і Якуб Колас узбагацілі беларускую літаратуру з мастацка-тэхнічнага боку. Яркі вобраз беззямельнага селяніна, які вымушан штогод вандраваць ад пана да пана ў пошуках работы, у пошуках магчымасці прыкласці сваю крывавую працу, свае рукі, лірычна-цёплы, абаяльны вобраз вясковай дзяўчыны, сялянкі-маці, вясковай моладзі, а поруч з гэтым вобраз сіраты, жабрака, бедняка з раскіданага панамі гнязда — і кляймілі спарахнеўшы палітычны лад, і будзілі абурэнне працоўных мас супроць царскіх парадкаў. Гусляр, які не баіцца смерці і ў вочы князю-ўладару кажа народную праўду, сялянка Бандароўна, якая ідзе на смерць, але не здавальняе прыхаці польскага пана-драпежніка, бацька яе, Бандарэнка, які ўзнімае народнае паўстанне супроць Патоцкіх, — вось якімі вобразамі ўзбагацілася беларуская літаратура ўжо ў першыя годы літаратурнай дзейнасці Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя змяніла аблічча Беларусі, знішчыла векавечны сацыяльны і нацыянальны гнёт. Вялікая камуністычная партыя пад кіраўніцтвам мудрых правадыроў Леніна і Сталіна вывела народы Савецкага Саюза праз агні грамадзянскай вайны, праз свяшчэнную вайну супроць інтэрвентаў да мірнай працы. Аповесцю «Дрыгва», паэмай «На шляхах волі», п'есай «У пушчах Палесся», шматлікімі вершамі і апавяданнямі адгукнуўся Якуб Колас на падзеі грамадзянскай вайны і барацьбы з інтэрвентамі. Паэмай «Барысаў», вершам «Партызаны», вершамі, прысвечанымі Чырвонай Арміі і таварышу Варашылаву, вершамі-песнямі, услаўляючымі гераічныя паходы Чырвонай Арміі, адазваўся Янка Купала.

У галіне распрацоўкі сучаснай савецкай тэматыкі Янка Купала і Якуб Колас таксама стаяць у першых радах нашай літаратуры. Годы вялікага пералому — годы калектывізацыі—адлюстраваны ў аповесці «Адшчапенец», у вершы «Калгаснае» — Якуба Коласа, у такіх надзвычайнай сілы вершах як «Сыходзіш, вёска, з яснай явы», «Песня калгасніцы» і іншых — Янкі Купалы.

Моцную сувязь з народам мы адчуваем і ў творчасці трэцяга пісьменніка-ордэнаносца, Змітрака Бядулі, аднаго з старэйшых нашых пісьменнікаў. Ён прышоў у літаратуру ў 1910 годзе, калі пасля галоў разгулу царскай рэакцыі пачынаўся зноў рэвалюцыйны ўздым. Гэта адбілася нават на першым зборніку вершаў у прозе Змітрака Бядулі «Абразкі», які мае рад рэалістычных, яркіх замалёвак цяжкога жыцця селяніна. Ускладняючы свой верш, свой паэтычны радок, даючы напружаны сюжэт для сваіх апавяданняў (успомніце хоць-бы «Пяць лыжак заціркі» ці «Адшчаслівіла»), Змітрок Бядуля, як і нашы народныя паэты, узнімаў літаратуру на новую, больш высокую ступень, аддаляў яе ад бытаапісальніцтва, набліжаў да ўзроўню рускай літаратуры. Глыбокае веданне народнай творчасці, народнага эпасу, народных казак двух народаў, лаканічнасць мовы рабіла творы Змітрака Бядулі блізкімі народу і зразумелымі яму.

У часы Савецкай улады Змітрок Бядуля ўзбагаціў беларускую літаратуру вялікім раманам «Язэп Крушынскі», першай гістарычнай аповесцю «Салавей». Раман «Язэп Крушынскі» — шырокае эпічнае палатно, глыбока ўскрыўшае жыццё беларускай вёскі і горада часоў НЭПа, паказаўшае каранні нацыянал-фашызма, здрадніцкую работу нацыянал-фашыстаў на Беларусі і супроцьставіўшае гэтай шкодніцкай рабоце інтэрнацыянальную салідарнасць працоўных. Пры высокіх мастацкіх якасцях рамана вылучаецца яго вострая палітычная накіраванасць, асабліва ў другой частцы.

Пісьменнікам шырокага размаху і глыбокіх літаратурных абагульненняў, праўдзіва адлюстроўваючым рэчаіснасць — такім знаюць Змітрака Бядулю працоўныя Савецкай Беларусі. І яны вітаюць яго з вялікай і заслужанай узнагародай.

Міхась Лынькоў — адзін з таленавітых пісьменнікаў паслякастрычніцкага перыяду. Пісьменнік-камуніст, ён прышоў у літаратуру ў часе засілля нацыянал-фашыстаў на літаратурным фронце. Ён адразу-ж уключыўся ў ачыстку літаратуры ад нацыянал-фашысцкай пагані. Яго творчую думку прыкавала да сябе адно з асноўных пытанняў нашай рэчаіснасці — рост новага, савецкага чалавека. Уважліва прыглядаецца Міхась Лынькоў да таго новага, што ўнесла рэвалюцыя ў думкі, у псіхалогію чалавека, адбірае самае тыповае, самае яскравае, звязвае цікавым сюжэтам, апранае ў глыбока-народнае цёплае слова, па-мастацку, з любоўю рысуючы і лірычны вобраз дзяўчыны Валі, загубленай белагвардзейцам Граеўскім, які прыкрываў свой твар шакала ўкрадзеным у расстралянага чырвонаармейца партбілетам, і вобраз местачковай дзяўчыны Рывы, якая ламае руціну сярэдневяковуя, ахоўваемую кагалам, і вобраз савецкага лётчыка Мядзведкі, прымаючага ад шэфаў самалёт, і вобраз ордэнаносца Андрэя Лятуна — старога чыгуначніка.

Міхась Лынькоў падводзіць беларускую літаратуру шчыльна к пытанням рабочай тэматыкі, паказваючы, як многа гераізму ўклаў рабочы клас Беларусі і ў абарону сваёй краіны і ў яе сацыялістычнае будаўніцтва. Поруч з гэтым Міхась Лынькоў надзвычай трапна разблытвае тыя змяіныя ходы, якімі прабіраецца вораг на нашы сацыялістычныя прадпрыемствы («Апошні звярыядавец»), у нашу партыю («Выпадак на чыстцы»), у нашу армію («Сінія галіфэ»). Гэтым самым Лынькоў загартоўвае нашу рэвалюцыйную пільнасць і дапамагае партыі і народу ачышчаць нашу свяшчэнную савецкую зямлю ад ворагаў і іх ахвосця.

Гэтай тэматыцы прысвечана творчасць і другога празаіка-ордэнаносца Эдуарда Самуйлёнка. Яго «Тэорыя Календрун»—паказчык вялікай назіральнасці пісьменніка. Але найбольш спелым творам Самуйлёнка з'яўляецца яго раман «Будучыня», напісаны на матэрыялах барацьбы грузінскага народа супроць меншавіцкага ўрада Ноя Жордан'я і яго англійскіх гаспадароў. Гэтым раманам Самуйлёнак расшырыў рамкі беларускай літаратуры, практычна паказаў, што высокамастацкія, вялікія палотны могуць быць створаны беларускімі пісьменнікамі на любым матэрыяле, цікавым і блізкім любому з народаў Савецкага Саюза.

Дзякуючы глыбокай назіральнасці Самуйлёнка, яго ўпартай працы над матэрыялам, вобразы грузінскіх сялян-паўстанцаў, як жывыя усталі перад нашым чытачом, усталі жывымі і тыя падзеі, якія адбываліся каля 20 год назад у далёкай Грузіі, яшчэ і яшчэ раз падкрэсліваючы адзінства лёсу працоўных усіх нацый, адзінства іх задач і адзінства барацьбы за выкананне гэтых задач. Духам баявога пралетарскага інтэрнацыяналізма, духам сталінскай дружбы народаў прасякнут гэты твор.

За апошні год тав. Самуйлёнак напісаў надзвычай цікавую п'есу «Пагібель воўка» — на матэрыялах нашага беларускага пагранічча. У «Пагібелі воўка» ён вывеў прадстаўнікоў нашага шчаслівага калгаснага сялянства, паказаў іх патрыятызм, іх непахісную волю зрабіць заходнюю мяжу Саюза ССР абсалютна непраніцаемай для ворага.

Пятрусь Броўка і Пятро Глебка належаць да найбольш таленавітых паэтаў БССР паслякастрычніцкага пакалення. Абодва яны вызначаюцца актуальнай савецкай тэматыкай, аратарскім голасам сваёй паэзіі, дасканаласцю свайго майстэрства. Пятрусь Броўка напісаў адну з лепшых паэм пра грамадзянскую вайну — «Праз горы і стэп». Сіла класа, які ўзняўся на змаганне супроць сваіх адвечных ворагаў з адзіным рашэннем альбо перамагчы, альбо памерці, адчуваецца ў кожным радку гэтага твора. Паэма «1914» у мастацка падазеных вобразах паказвае, чым была вайна 1914 года для працоўных. Надзвычай яркім і жыццёвым з'яўляецца вобраз селяніна Перагуда, які з'явіўся з вайны ў роднае сяло без рук і без ног і, разабраўшыся ў тым, у імя чаго вялася вайна, «аскабалкамі рук» зрывае з грудзей крыжы і медалі. Таксама хвалюе вобраз сялянкі Кацярыны з аднайменнай паэмы «Кацярына». Цяжкое маленства і юнацтва на службе ў кулака, лёс, які рыхтавала Кацярыне жыццё пры старым ладзе, былі поўны гора, пакут і слёз. Але Савецкая ўлада вывела яе на іншую дарогу, зрабіла гаспадаром жыцця, яго творцам. І Кацярына быццам зноў нарадзілася на свет, яна стала новым чалавекам. Працуючы на калгаснай ферме, чэсна адносячыся да працы, яна стала знатным чалавекам краіны.

Пятрусь Броўка — аўтар лібрэта першай савецкай беларускай оперы «Міхась Падгорны», якая пойдзе гэтымі днямі ў Дзяржаўным тэатры оперы і балета.

Пятро Глебка — адзін з паэтаў, якія найбольш упарта працуюць над удасканаленнем мастацкага слова. У яго ёсць рад вельмі высокіх па сваіх мастацкіх якасцях вершаў. Але найбольшую каштоўнасць прадстаўляюць дзве яго апошнія паэмы — «Мужнасць» і «У тыя дні», у якіх апяваецца рэвалюцыйная падзеі 1917 года і паказана ўсенароднае гора з прычыны смерці Уладзіміра Ільіча Леніна. Вялікая тэма, суровая прастата мовы, глыбокае разуменне адзінства народа, партыі і яе правадыроў — робяць гэтыя паэмы аднымі з лепшых у беларускай літаратуры. Трэба асабліва вітаць спробу тав. Глебкі паказаць вобраз Серго Орджанікідзе ў новай сваёй п'есе «Над Бярозай-ракой».

Трэба адзначыць таксама вялікую работу, якую прарабілі нашы ордэнаносцы па перакладу Пушкіна, Някрасава, Шота Руставелі, Шаўчэнка, у напісанні калектыўных твораў, у тым ліку вядомых усім «Пісьма беларускага народа вялікаму Сталіну» і «Дванаццаці песень».

Вялікае ўзнагароджанне лепшых пісьменнікаў Беларусі разам з пісьменнікамі ўсіх братніх народаў СССР радуе сэрца кожнага працоўнага. Яно адлюстроўвае нашы поспехі на адным з найбольш адказных участкаў сацыялістычнага будаўніцтва — на ідэалагічным фронце. Гэты ўчастак набывае зараз, у трэцяй сталінскай пяцігодцы, выключнае значэнне. Пісьменнікі Савецкай Беларусі разумеюць, якія вялікія задачы ставяць перад імі народ і партыя, і прыкладуць усе сілы, каб справіцца з гэтымі задачамі.

ПІСЬМЕННІКАМ-ОРДЭНАНОСЦАМ т. т. Я. КУПАЛУ, Я. КОЛАСУ, З. БЯДУЛЮ, М. ЛЫНЬКОВУ, Э. САМУЙЛЁНКУ, П. БРОЎКУ, П. ГЛЕБКУ

ПРЫВІТАННІ АД РАБОТНІКАЎ МАСТАЦТВАЎ

Беларускі рэспубліканскі камітэт саюза работнікаў мастацтваў шчыра вітае вас з высокай узнагародай, якой партыя і ўрад адзначылі вашу плённую работу ў літаратуры на карысць вялікага совецкага народа.

Вялікая ўвага партыі Леніна—Сталіна, совецкага ўрада да работнікаў літаратуры і мастацтва натхняе ўсіх творчых работнікаў культурнага фронта Совецкай Беларусі на стварэнне новых выдатных мастацкіх твораў, услаўляючых сонечныя дні нашай сталінскай эпохі.

Прэзідыум Беларускага рэспубліканскага камітэта саюза работнікаў мастацтваў.

* * *

Праўленне Саюза совецкіх мастакоў БССР горача вітае новы атрад ордэнаносцаў на культурным фронце.

Разам з пісьменнікамі нашай ордэнаноснай Совецкай Беларусі, з усёй грамадскасцю мы радуемся высокай узнагародзе, якую атрымалі лепшыя майстры беларускай літаратуры

Усе працоўныя БССР ведаюць аб значнай рабоце, праробленай узнагароджанымі пісьменнікамі па стварэнню і развіццю беларускай літаратуры. Творчасць народных паэтаў БССР Янкі Купалы, Якуба Коласа, пісьменнікаў Змітрака Бядулі, Міхася Лынькова, Эд. Самуйлёнка і паэтаў Броўкі і Глебкі вядома далёка за межамі БССР, бо іх творчасць — гэта словы радасці і ўдзячнасці беларускага народа, які пад кіраўніцтвам вялікай партыі Леніна — Сталіна атрымаў сваю дзяржаўнасць.

Высокая ўзнагарода партыі і ўрада будзе натхняць нас усіх — і мастакоў, і пісьменнікаў, і кампазітараў — на стварэнне новых поўнацэнных твораў, у якіх работнікі літаратуры і мастацтва сумеюць адлюстраваць хвалюючыя іх пачуцці глыбокай адданасці партыі і ўраду, хто так чула, па-бацькоўску клапоціцца аб кадрах культурнага фронта.

Мы ўпэўнены, што ўзнагароджаныя пісьменнікі, натхнёныя высокай ацэнкай іх творчасці, у гонар набліжаючагася восемнаццатага з'езда ВКП(б) разгорнуць работу па стварэнню манументальных твораў, у якіх яшчэ больш ярка і шматгранна будзе паказана цудоўная гераіка сталінскай эпохі, росквіт магутнай краіны соцыялізма, якая з'яўляецца бацькаўшчынай прыгнечанага чалавецтва ўсяго свету.

Няхай жыве совецкая літаратура — магутная зброя культурнай рэвалюцыі!

Няхай жыве партыя Леніна—Сталіна — арганізатар і кіраўнік нашых перамог!

Няхай жыве лепшы друг совецкай літаратуры і мастацтва — наш родны Іосіф Вісарыёнавіч Сталін!

Праўленне Саюза совецкіх мастакоў БССР.

* * *

З глыбокай радасцю даведаліся мы аб высокай узнагародзе, якой Прэзідыум Вярхоўнага Совета Саюза ССР адзначыў вашы заслугі перад беларускім народам і перад народамі вялікага Совецкага Саюза.

Узнагароджанне вас ордэнамі Совецкага Саюза служыць лепшым доказам клопатаў комуністычнай партыі і ўрада, нашага вялікага Сталіна аб развіцці культуры і мастацтва народаў соцыялістычнай радзімы і аб тых, хто аддае свае сілы на служэнне гэтай справе.

Горача вітаючы вас з высокай і ганаровай узнагародай, мы выражаем упэўненасць, што ваша творчая дзейнасць на карысць совецкага народа яшчэ больш узмацніцца, і вашы таленавітыя песні, якія адлюстроўваюць нашу гераічную эпоху, будуць выкарыстаны намі ў музычнай творчасці.

Кампазітары БССР: В. ЕФІМАЎ, А. АЛАДАЎ, М. РАВЕНСКІ, Т. ШНІТМАН, М. ІВАНОЎ.

* * *

Дырэкцыя і работнікі Інстытута літаратуры і мовы Акадэміі навук БССР горача вітаюць пісьменнікаў БССР, узнагароджаных ордэнамі Совецкага Саюза.

Гэта ўзнагароджанне з'яўляецца высокай ацэнкай і прызнаннем высокага ўзроўню беларускага мастацкага слова. Мы ўпэўнены, што ўзнагарода, атрыманая нашымі пісьменнікамі, будзе магутным стымулам для іх далейшага творчага росту і ўздыму і што пісьменнікаў БССР, мы жадаем вам рамі поўнасцю апраўдаюць вялікае давер'е, аказанае ім партыяй Леніна—Сталіна.

Ад імя Інстытута: БАРЫСЕНКА, ФІГЛОЎСКАЯ, ШКЛЯР.

* * *

Калектыў Тэатра юнага гледача БССР падзяляе вялікую радасць усіх работнікаў літаратуры і мастацтва Совецкай Беларусі — радасць усведамлення таго, як высока цэніць наша партыя і наш урад творчую работу ў галіне літаратуры і мастацтва.

Віншуючы вас — ордэнаносцаў-пісьменнікаў БССР, мы жадаем вам новых творчых поспехаў і чакаем ад вас стварэння новых п'ес аб нашых вялікіх днях соцыялізма, — п'ес, якіх чакае наш глядач — слаўнае маладое сталінскае пакаленне.

Калектыў Тэатра юнага гледача БССР.

* * *

Віншуем з высокім узнагароджаннем пісьменнікаў Купалу, Коласа, Бядулю, Самуйлёнка, Лынькова, Броўку, Глебку. Мы шчыра рады і ад душы жадаем вам новых поспехаў.

Дырэкцыя, партком і творчая секцыя кіностудыі «Совецкая Беларусь».

Ленінград.

ПРЭМ'ЕРЫ ЛЕНІНГРАДСКІХ ТЭАТРАЎ

У студзені 1939 года ленінградскія тэатры паказалі рад цікавых прэм'ер.

Малы оперны тэатр, які справядліва называецца «лабараторыяй совецкай оперы», паказаў оперу «Маці» кампазітара В. Жэлабінскага. Інтэнсіўная работа над гэтай операй вялася на працягу поўгоддзя. Тэатр дапамог лібрэтысту А. Прэйсу прыбліаіць лібрэта оперы да геніяльнага рамана М. Горкага. Супрацоўніцтва тэатра з кампазітарам і драматургам дало добрыя вынікі.

Музыка оперы насычана рускімі народна-пэсеннымі матывамі. Шырока выкарыстаны матывы старых рабочых песень і фальклор гарадскіх ускраін.

Опера пастаўлена засл. арт. РСФСР С. Бірман і Н. Гараінавым (рэжысёр асістэнт).

Ленінградскі глядач цёпла прыняў оперу «Маці», але работу над ёю нельга лічыць закончанай. Сюжэтна лібрэта Прэйса зроблена добра, драматургічна войстра і сцэнічна. Але слова ў гэтай оперы не заўсёды поўнаважкае, вобразнае і паэтычнае. Калі будзе ліквідаван гэты дэфект, вартасць оперы значна ўзрасце.

Ленінградскі тэатр камедыі паказаў прэм'еру п'есы Юрыя Германа «Сын народа». Герой п'есы — таленавіты совецкі доктар Кузьма Калюжны, дзеяч перадавой навукі. У глыбокай правінцыі ён вядзе велізарную навуковую работу, у выніку якой створан выдатны метад звароту зроку сляпым. Цудоўныя і хвалюючыя сцэны «празрэння» настаўніка Пархоменка (арт. Б. Тэнін) і Вольгі. Поўная гумару роля юнага «брата міласэрнасці» Цімафеіча ў выкананні артысткі Барабанавай. Кузьму Калюжнага іграе артыст Э. Гарын, ён-жа пастаноўшчык спектакля. Э. Гарын стварыў цікавы вобраз героя навукі, чалавека, поўнага ненасытнай страсці да эксперыментыравання. Глядач добра прымае гэты спектакль, не пазбаўлены, аднак, рысаў слязлівай сантыментальнасці.

У аснове п'есы М. Гуса і К. Фінна «Ключы Берліна», паказанай у тэатры, якім кіруе засл. арт. рэсп. С. Э. Радлаў, ляжыць сапраўдны гістарычны факт. У жніўні 1759 года прускія войскі на чале з каралём Фрыдрыхам II былі разгромлены рускімі пры Кунерсдорфе. Рускія занялі Кенігсберг, Мемель, усю Усходнюю Прусію і праз год пераможна ўвайшлі ў сталіцу Прусіі — Берлін. Камендант сталіцы ўручыў ключы Берліна афіцэру рускай арміі. Ключы ад заваяванай сталіцы, як баявыя трафеі, захоўваліся ў б. Казанскім саборы ў Ленінградзе. П'еса «Ключы Берліна» актуальна гучыць зараз, калі ўзмоцнена бразгаюць зброяй «арыйскія» падпальшчыкі сусветнай вайны. Павучальны гістарычны экскурс!

Цікавую працу прарабіў Ленінградскі тэатр драмы імя А. С. Пушкіна. Ен ажыццявіў новую рэдакцыю аднаго з сваіх старэйшых спектакляў—«Маскарада» М. Ю. Лермантава. Упершыню гэта драма была паказана на сцэне Александрынскага тэатра 25 лютага 1917 года ў пастаноўцы В. Э. Мейерхольда. Новая рэдакцыя спектакля была таксама даручана нар. арт. рэсп. В. Э. Мейерхольду, які прарабіў велізарную работу па рэалістычнаму асэнсаванню кожнага вобраза спектакля. На прэм'еры ролю Арбеніна ў 800-ты раз сыграў нар. арт. РСФСР Ю. М. Юр'еў. Як і 22 годы назад, баранесу Штраль іграла засл. дзеяч маст. Е. І. Тімме і князя Звяздзіча — арт. Е. П. Студзенцоў. Спектакль цёпла прымаецца гледачамі.

Тэатр оперы і балета імя С. М. Кірава аднавіў, пасля доўгага перапынку, геніяльную оперу Д. Вердзі «Отэлло». У ролі Отэлло выступае засл. арт. рэсп. Н. Печкоўскі, які з'яўляецца адначасова і пастаноўшчыкам спектакля. Партыю Дэздэмоны спявае Ф. Розен, партыю Яго — арт. Ульянаў, Эміліі — С. Іўніцкая.

Народны артыст РСФСР Барыс Бабачкін паставіў у Вялікім драматычным тэатры імя М. Горкага п'есу Горкага «Дачнікі». Спектакль атрымаўся яркім, уражлівым. Асабліва вылучаюцца вобраз Мар'і Львоўны, створаны арт. Д. Вольперт, і вобраз Власа, створаны арт. Бабачкіным.

А. МАІСЕЕЎ.

ЛЕНІНГРАД. **(Наш. кар.).**

Шэўчэнка ў творчасці мастакоў-самавучак

Одэскі Дом народнай творчасці рыхтуе тэматычную выстаўку: «Шэўчэнка ў творчасці самадзейных мастакоў». Пры Доме народнай творчасці адкрыта школа, дзе па выходных днях вучацца самадзейныя мастакі. У школе разгорнута вялікая работа па падрыхтоўцы да выстаўкі.

І. Д.

Кіеў. (Наш. кар.).

Новыя рэжысёры ў тэатрах БССР

За апошні час тэатры БССР папоўніліся новымі кваліфіцыраванымі работнікамі.

У Віцебскім Бэлдзяржрамтэатры прыступіў да работы рэжысёр Аксёнаў, які да апошняга часу працаваў у Кіеўскім рускім драматычным тэатры.

Галоўным рэжысёрам у Рускі тэатр БССР запрошан В. Н. Бернс, які працаваў у Малым маскоўскім Акадэмічным тэатры. Былы мастацкі кіраўнік Рускага тэатра Данацці вызвален ад сваіх абавязкаў.

У Рускі-ж тэатр запрошан для ажыццяўлення адной пастаноўкі засл. дзеяч маст. Празароўскі.

У Тэатры юнага гледача новую пастаноўку «Блакітнае і ружовае» ажыццявіў засл. дзеяч маст. Грузінскай ССР Н. Я. Маршак. У чэрвені бягучага года для работы над пастаноўкай «Прадзелкі Скапена» Мальера ў Тэатр юнага гледача прыедзе Пыжова (Маскоўскі тэатр Рэвалюцыі).

Мастацкім кіраўніком Лялечнага тэатра працуе Жавінскі, які раней працаваў у Кіеўскім лялечным тэатры.

У Беларускі драмтэатр запрошаны рэжысёр Громаў (для пастаноўкі «Рамео і Джульеты») і рэжысёр Маскоўскага Мастацкага тэатра ордэнаносец І. М. Раеўскі (для пастаноўкі п'есы Горкага «Ворагі»).

У Віцебскі беларускі драмтэатр запрошан на пастаноўку «Рэвізора» альбо «Егора Булычова» Захава — з тэатра імя Вахтангава.

У Тэатры музкамедыі працуе рэжысёр Джуста.

У Тэатры оперы і балета рэжысёр Галейзоўскі працуе над пастаноўкай балета «Бахчысарайскі фантан», рэжысёр Лапухоў — над балетам «Салавей».

А. С. ГРЫБАЕДАЎ

(ДА 110-ГОДДЗЯ З ДНЯ СМЕРЦІ)

11 лютага 1829 года ў Тэгеране быў забіт геніяльны рускі пісьменнік-драматург Аляксандр Сяргеевіч **Грыбаедаў.**

Аляксандр Сяргеевіч Грыбаедаў, па сведчанню А. С. Пушкіна, быў «адным з самых разумных людзей у Расіі» і адным з самых адукаваных людзей эпохі.

Пяру Грыбаедава належыць шмат твораў. У перыяд з 1814 па 1823 год ім перакладзена з французскай мовы шмат сцэнічных твораў («Маладыя супругі», «Прытворная няверпасць» і інш.), а таксама напісаны арыгінальныя творы — камедыі «Студэнт» і «Свая сям'я», сатыра «Лубачны тэатр» і г. д. Усе гэтыя творы не выходзілі за рамкі звычайнага аматарства і таму не прадсказвалі ў Грыбаедаве геніяльнага аўтара камедыі «Гора ад ума».

Асноўнай тэмай камедыі «Гора ад ума» з'яўляецца лёс двараніна-вольнадумца Чацкага ў варожым акружэнні свайго-ж уласнага класа. Словамі Чацкага Грыбаедаў войстра крытыкуе дваранска-чыноўніцкую Маскву, пагоню за багаццем, тупасць і ленасць дваранства. Сваёй формай, у асаблівасці мовай, а таксама сваім шырокім соцыяльна - грамадскім зместам «Гора ад ума» стварыла пераварот у рускай драматургіі.

Камедыя ўзняла вакол сябе шумную журнальную палеміку. Выражальнікі думак дваранска-чыноўніцкай Масквы ярасна нападалі на камедыю, адмаўляючы не толькі правільнасць намаляванай у ёй аўтарам карціны, але і яе мастацкую вартасць. У той-жа час прадстаўнікі новых грамадскіх груп — дзекабрыст А. А. Бестужаў і іншыя — далі аб ёй захопленыя водгукі. Будучыя ўдзельнікі дзекабрысцкага паўстання выкарыстоўвалі «Гора ад ума» нават і ў мэтах палітычнай прапаганды.

Паяўленне камедыі на сцэне сустракалася рознымі класамі па-рознаму, але заўсёды камедыя мела поспех. Так, напрыклад, у перыяд з 1906 па 1927 год у адным толькі Маскоўскім мастацкім акадэмічным тэатры «Гора ад ума» пастаўлена 205 разоў.

На совецкай сцэне «Гора ад ума» карыстаецца заслужаным поспехам. Камедыя раскрывае перад совецкім гледачом карціну, на якой вакол вольнадумца Чацкага кружацца камічныя ўроды — параджэнне самаўпэўненай пошласці, чванства і хамства, маральнай і грамадзянскай крывадушнасці, няправімага ўнутранага мяшчанства, прыкрытага знешнім арыстакратызмам, тупавумна - нерухомай ленасці, цынічнай ілжы ад няма чаго рабіць альбо ад злосці. Совецкі глядач бачыць у камедыі жыццё паразітычнага класа і вучыцца ненавідзець усіх і ўсякіх паразітаў.

Д. ОСІН.

АБ НЕПІСЬМЕННЫХ КРЫТЫКАХ І ДАВЕРЛІВЫХ РЭДАКТАРАХ

Нельга сказаць, каб газета «Советская Белоруссия» зрабіла асабліва многа для азнаямлення сваіх чытачоў з жыццём і творчасцю вялікага украінскага паэта Тараса Грыгор'евіча Шэўчэнка. Больш таго, нават у тым нязначным — і па колькасці і па якасці — матэрыяле, які газета друкавала аб Шэўчэнка, дапушчана столькі памылак, столькі недакладнасцей, што абыйсці гэта маўчаннем ніяк нельга.

Мы маем на ўвазе артыкул А. Алмазава, надрукаваны ў газеце «Советская Белоруссия» ад 8 снежня 1938 года. Артыкул гэты — падвальны і прэтэндуе на раскрыццё вельмі важнай тэмы: «Шэўчэнка—пясняр свабоды і братэрства народаў». Але чытаючы яго, з першых-жа радкоў пачынаеш здзіўляцца, і здзіўляцца не столькі лоўкасці рук паважанага крытыка, колькі даверлівасці рэдактараў «Советской Белоруссии», якія гатовы друкаваць усё, што-б ім ні падсунулі

У артыкуле Алмазава — што ні радок, то памылка. Першая з іх — сцвярджэнне, што Шэўчэнка пражыў 46 год. Усім вядомы даты нараджэння і смерці паэта: 1814 — 1861. Калі-б рэдактары «Советской Белоруссии» ведалі арыфметыку, яны лёгка змаглі-б падлічыць, што Шэўчэнка пражыў 47 год.

Але гэта не ўсё. Крыху далей мы чытаем: «Ен (Шэўчэнка) нарадзіўся 14 лютага 1814 года. А ў адзін з дзён сакавіка 1860 года дрыжачая рука паэта абарвала на шматкроп'і чарговую фразу ў яго дзённіку. 11 сакавіка 1860 года паэт памёр».

Няма чаго сказаць, чуллівыя радкі, моцна і вобразна сказана; асабліва што «дрыжачая рука абарвала на шматкроп'і фразу». Але адкуль узяў паважаны Алмазаў дату: 14 лютага 1814 года, калі нават школьніку вядома, што Шэўчэнка нарадзіўся 9 сакавіка (25 лютага па ст. стылю). Гэта паершае. Па-другое-ж, мы першы раз чуем, што Шэўчэнка памёр у 1860 годзе. Навошта было скарачаць жыццё паэта на цэлы год?

Аўтар артыкула з самым сур'ёзным выглядам сцвярджае, што Тарас Грыгор'овіч на восьмым годзе свайго жыцця страціў бацьку і маці. З біяграфіі паэта вядома, што маці яго памёрла, калі яму было 9 год, а бацька — калі яму было 12 год. Вядома і тое, што самыя цяжкія годы маленства паэта прыпадаюць на той час, калі ў сям'і паявілася мачыха. Мы не разумеем, адкуль-бы ўзялася ў Шэўчэнка мачыха, калі-б бацька і маці яго памёрлі ў адзін час. Ці зможа гэта растлумачыць сам Алмазаў?

Яшчэ больш грубай памылкай з'яўляецца сцвярджэнне, што Шэўчэнка быў выкуплен на волю, калі яму споўнілася 28 год. Гэта мы чуем упершыню, бо добра вядома, што паэт быў выкуплен на волю ў 1838 годзе, г. зн. тады, калі яму было 24 годы. У 28 год Шэўчэнка быў ужо вядомым паэтам.

Даверлівыя рэдактары «Советской Белоруссии» дазволілі Алмазаву сказіць лепшы рэвалюцыйны верш Шэўчэнка, яго «Заповіт». Алмазаў прыводзіць такую цытату з гэтага верша:

> «... поднимайтесь,
> цепи разорвите,
> злою вражескою кровью
> цепи окропите».

Кожнаму вядома, што Тарас Грыгор'евіч Шэўчэнка заклікаў украінскі народ акрапіць варожай крывёю не «цепи», а «волю», і апошні радок чытаецца: «волю окропите». «Советская Белоруссия»ператварыла рэвалюцыйны лозунг Шэўчэнка ў самы антынародны, рэакцыйны заклік **асвяціць** ланцугі, якімі быў скуты украінскі народ.

Згодна сцвярджэнняў «Советской Белоруссии» Шэўчэнка напісаў твор «Гайдаматчына», а не «Гайдамакі».

Няма патрэбы прыводзіць астатнія памылкі і недакладнасці, якімі перапоўнен артыкул Алмазава.

Самае незразумелае ў гэтай гісторыі, што «Советская Белоруссия» чамусьці не выпраўляе тых памылак, якія дапушчаны ёю ў асвятленні жыцця і творчасці Тараса Грыгор'евіча Шэўчэнка.

В. КОЛАС.

У дапамогу настаўніку

Міх. ЛАРЧАНКА

СЯЛЯНСКАЕ ЖЫЦЦЁ І ВОБРАЗЫ ПАНОЎ У ТВОРЧАСЦІ Ф. БАГУШЭВІЧА

НА фоне гістарычнай абстаноўкі літаратурнага руху канца XIX стагоддзя Ф. Багушэвіч займае своеасаблівае месца і з'яўляецца цікавым пісьменнікам. У гэты час ён быў першым беларускім паэтам-рэалістам, які імкнуўся ў сваёй творчасці праўдзіва адлюстраваць некаторыя істотныя бакі жыцця беларускага народа. Творчасць яго супярэчлівая; побач з рэакцыйна-нацыяналістычнымі момантамі ў творчасці Ф. Багушэвіча даволі моцным быў элемент дэмакратычны —патрабаванне палітычнай свабоды для прыгнечанага народа. Асновай творчага метада паэта з'яўляецца рэалізм, праўдзівае адлюстраванне жыцця. Творчасць яго носіць грамадска-палітычны характар; яна прасякнута нацыянальнымі і соцыяльнымі матывамі. Гэта яскрава праяўляецца ва ўсіх яго творах, паэтычных вобразах, слоўна-мастацкіх сродках.

У вершы «Мая дудка» Багушэвіч вызначае паэтычны характар сваёй паэзіі і яе грамадскую функцыю. Ен жадаў-бы зайграць так, каб натрапіць —

> Вадзіцы хоць каплю,
> Ды такой вадзіцы,
> Ды з такой крыніцы,
> Што як хто нап'ецца,
> Дык вольным стаецца.

У гэтым глыбока-лірычным вершы выказаны дэмакратычныя імкненні паэта, выказана яго жаданне апяваць жыццё народа, долю народную, падкрэслены гуманныя пачуцці паэта да народа.

Як-жа адлюстраваў Багушэвіч у сваёй творчасці беларускую рэчаіснасць, жыццё нашага народа ў другой палове XIX стагоддзя?

Перш за ўсё трэба падкрэсліць, што ў творчасці Багушэвіча праўдзіва паказаны асноўныя класавыя супярэчнасці эпохі, супярэчнасці паміж панамі-памешчыкамі і сялянствам. Багушэвіч, як ліберальны дэмакрат, спачувае беларускаму сялянству, якое знаходзілася пад страшэнным соцыяльным і нацыянальным прыгнётам і бесчалавечна эксплаатыравалася памешчыкамі. У вершы «Дурны мужык, як варона» паэт дае сурова-праўдзівыя малюнкі жыцця беларускага працоўнага селяніна — мужыка, прыціснутага падвойным, соцыяльным і нацыянальным, прыгнётам.

Больш таго, у вершы «Гора», які напісан у плане пераймання фальклорнай песні, Багушэвіч дае нам вобраз селяніна, які жыве ўсё сваё жыццё ў беспрасветным горы.

> Склаў я гора ды у доскі,
> Закапаў у велькі роў,
> Адышоў ад ямы трошкі,
> Аж у цябе гора зноў.
> Ой, гора-ж маё!
> Склаў я гора ў тарбіну,
> Аж ў Амэрыку павёз,—
> Думаў: тут або я згіну,
> Або з гора будзе лёс.
> Ой, гора-ж маё!
>
> Дык і тут няма пакою:
> З горам лёг і з горам ўстаў:
> Мусіць бог яго з душою
> Разам возьме, разам даў.
> Ой, гора-ж маё!

Тут усё—і рэфрэн «Ой, гора-ж маё», якім заканчваецца кожная чатырохрадковая страфа верша, і частушачная прастата і напеўнасць рытмікі, і каларытнасць мовы—гаворыць аб тым, што Багушэвіч умела выкарыстоўваў вусную народную творчасць.

У плане фальклорнай песеннасці паказваюцца Багушэвічам праўдзівыя карціны сялянскай беднасці і ў вялікай паэме «Кепска будзе».

> Пераеўся хлеб да крышкі,
> Бульбы толькі як пасеяць,
> І прыварку ані лыжкі,
> І скаціна—хоць развеяць.

Ёсць у Багушэвіча некалькі твораў, у якіх ён у пэўнай меры вызваляецца ад сваёй абмежаванасці і ўзнімаецца да крытычнага рэалізма, да глыбокага і праўдзівага паказу сялянскага жыцця. Прыкладам можа служыць верш «Песня VI» са зборніка «Смык беларускі».

У гэтым кароткім вершы селянін у сваіх надзвычай дасціпных адказах на пытанні апавядае аб сваім бяспраўным жыцці. Апавядае ён настолькі ўдала, што яго адказы з'яўляюцца палітычнай сатырай на тыя соцыяльныя ўмовы, у якіх жыла беларуская вёска.

> Чаго бяжыш, мужычок?
> — Паганяе мароз.
> Чаму ляжыш, мужычок?
> — Бо ураднікa вёз.
> Чаго ты п'еш, мужычок?
> — Бо і хлеба не еў.
> За што ты б'еш, мужычок?
> — Бо і сам тое меў.
> На што ты краў, мужычок?
> — Бо свайго не пазнаў.
> Чаму ўмёр, мужычок?
> — Уцякаў ад закона.

У вершы «Бог не роўна дзеліць» Багушэвіч у форме кампазіцыйнага кантрасту дае глыбока-рэалістычны паказ соцыяльнай супярэчнасці паміж багаццем і беднасцю, паміж панам-эксплаататарам і селянінам-эксплаатыруемым:

> Чым то дзеецца па свеце,
> Што няроўна дзеліць бог.
> Адзін ходзіць у саеце,
> У золаце з плеч да ног,
> А другому, каб прыкрыцца
> Хоць анучай,—велькі труд;
> Адны латы, адзін бруд.
> Увесь, як рэшата, свяціцца.

Далей паэт паказвае, што багач-пан мае «хатаў многа», жыве ў добрых пакоях, а селянін-бядняк жыве ў такой хаце, дзе «ў сцяне дзіры, а ўнутры вецер ходзіць, дым і снег; тут карова, свінні, куры, тут пакута, тут і грэх». Адзін «хлеба і не знае, толькі мяса, ды пірог»; а другі—«хлеб жуе з мякінкай, хлебча квас, ды лебяду». І, нарэшце, Багушэвіч у гратэскным плане высмейвае пана-эксплаататара, супроцьстаўляючы яму селяніна-бедняка.

> Аднаму дзесяткі-служкі
> Зарабляюць соткі сот;
> Рукі яго, як падушкі,
> Як кісель, дрыжыць жывот.
> Другі сам аж на дзесятак
> Працуючы, лле свой пот,
> А высах-жа, як аплатак,
> Цянюсенькі, як той кнот.

Усе гэтыя прыклады сведчаць аб тым, што Багушэвіч у асобных сваіх творах рэалістычна паказваў жыццё беларускай вёскі і ўскрываў соцыяльныя супярэчнасці паміж панамі і сялянствам. У гэтым заключаецца прагрэсіўнасць твораў Багушэвіча, прысвечаных паказу сялянскага жыцця, у гэтым іх рэалізм і іх значэнне.

Вобразы паноў-памешчыкаў Багушэвіч паказваў сатырыстычна ў плане крытычнага рэалізма. Ен спачувальна адносіцца да селяніна-мужыка, якога эксплаатыруе пан, і знішчальным сарказмам бічуе паноў.

У вершы «Панская ласка» Багушэвіч дае нам вобраз разбойніка-бандыта, які на дарозе «затрымаў панскі рыдван», ссадзіў пана, сам сеў у яго карэту, а таго прымусіў голым і босым бегчы па марозу. У канцы паэт заўважае, што і бандыт і пан аднолькава здабываюць сваё дабро «крыўдай братняй».

У вершы «Не ўсім адна смерць» паэт зарысоўвае багатага пана, які жыў у палацы і «не мог палічыць сваіх грошай», якіх у яго было—як бульбы. Пан з яго быў нядобры, бо сам ён нічога не рабіў, «еў, ды піў, ды крыўдзіў народ, ды грошы здзіраў, дзе прымог». Тут-жа даецца рэалістычная зарысоўка мужыка, у якога «хата ў дзюрах, як лапаць ды з лык», і які «сам па два дні нічога не еў». І калі прышла смерць, то пана «дактары сцерагуць; лечаць рану». А калі крыўдзіцель-пан усё-ж памірае, душу яго забірае чорт, затое мужык-гаротнік у зарысоўцы Багушэвіча «ўміраў, як заснуў, ані пікнуў, ён лёгка ўмёр, клікаў смерць, бо хлеба не стала». Яго «мужыцкі дух» пападае не да чорта, а бадзяецца па свеце, бо «не мае прытулку нідзе той мужык».

У творы пад назвай «Быў у чыстцы» які з'яўляецца палітычным памфлетам, сатырай на рэформу 1861 года, Багушэвіч вуснамі селяніна-мужыка саркастычна бічуе нянавісных яму багатых паноў, эканомаў, соцкіх, ураднікаў. У гэтым творы Багушэвіч выказвае сваё незадаволенне рэформай 1861 года, пасля якой «ні не болей настала паноў, не надта свабодна ў гэтай свабодзе».

Сваіх супраціўнікаў-паноў Багушэвіч ска высмейвае, змяшчае іх у пекле-чыстцы, дзе іх «чэрці кормяць смалой і гатуюць у смале, і пягаюць, і рвуць, запрагаюць у воз, кручком цягнуць кішкі і зубамі за нос, вочы колюць ражном, пузырамі рвуць твар, скрабуць шкуру нажом, як на боты тавар».

Багушэвіч далей паказвае, што гэтыя паны ў пекле —

> Без прывычкі, дык стогнуць, аж страх.
> Глянеш — пан, як здаецца, мядзведзь,
> А чорт дышлам запрог і трах-тарарах,
> Бічам б'е, ражном пора ў тыл.

Апрача багатых паноў, у пекле можна сустрэць і эканома, які «ссох ад агню — толькі скура ды косць», і ксяндза, якога «чорт аблажыў грашыма, запаліў у грашох тых, і ксёндз так гарыць», і станавога з старшыной, якім «чорт усе грошы збярэ, скруце цвёрды круцель або жмут, ды у горла запрэ і даўбешкай пярэ».

У прыведзеных творах Багушэвіч выступае перад намі як рэаліст і як сатырык, які ў гратэскна-шаржыраваным плане дае сатырычныя вобразы паноў-эксплаататараў. І слоўна-мастацкія сродкі пісьменніка ў гэтых творах знарачыта грубаватыя, але па народнаму сакавітыя. Самы рытмічны склад верша, то частушачна-гуллівы («Гора», «Панская ласка», «Бог не роўна дзеліць», «Мая дудка» і інш.), то празаічна-цяжкаваты («Праўда», «Быў у чыстцы», «У вастрозе» і інш.), — удала выкарыстан Багушэвічам у сатырычным паказе нянавісных яму паноў, якія здзекаваліся з працоўнага народа. Тут нянавісць паэта да паноў-эксплаататараў супадае з нянавісцю шырокіх сялянскіх мас да сваіх прыгнятальнікаў. На гэтай аснове ў Багушэвіча паяўляюцца элементы народнасці, а адсюль — слоўна мастацкія сродкі, лексіка, фразеалогія і рытмічны склад вершаў, адсюль паказ сялянскага жыцця і абмалёўка вобразаў паноў у яго панароднаму простыя і сакавітыя.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Менск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Уп. Галоўлітбела № Р-131.